ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрук“)
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. расьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. збадатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

АУТОРАК, 24 чэрвеня 1930 г.
№ 146 (3744)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю і асеньняй сяўбы, мерапрыемствы па разьвіцьці жывёлагадоўлі—

РАЗГАРНУЦЬ НЕАДКЛАДНА І ПА-БАЯВОМУ

...ючы рашучы адпор кулацтву, змагаючыся з правым апартунізмам і „левымі“ загібамі, усямерна ўмацоўваючы калгасы, усяляк дапамагаючы ...няцка-серадняцкім гаспадаркам і ўцягваючы іх у вытворчыя таварыствы,—забясьпечым далейшае разьвіцьцё калгаснага руху і ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі

Разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, правільнай арганізацыяй працы ў калгасах, рацыянальным скарыстаньнем с.-г. машын і інвэнтару—даб'емся максымальнай эфэктыўнасьці ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі

УСІМ АКРУГКОМАМ І РАЙКОМАМ КП(б)Б

XIII зьезд КП(б)Б падкрэсьліў, што ...пасьпяховага правядзеньня ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі ў ...начнай ступені будзе залежаць замацаваньне дасягнутых посьпехаў у справе калектывізацыі і далейшае разгортваньне калектывізацыі бядняцкіх і серадняцкіх мас на гэтай аснове.

Па падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы на мясцох яшчэ амаль нічога не зроблена, не разгорнута масавая работа сярод бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі і не мабілізаваны партыйныя масы, камсамол і калгаснікі на правядзеньне гэтых маючых вялікае эканамічнае і палітычнае значэньне кампаній. ЦК КП(б)Б абавязвае ўсе АК, РК і ячэйкі КП(б)Б, усе савецкія і каапэрацыйныя ўстановы забясьпечыць поўнае і пасьпяховае правядзеньне ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі і выканаць вызначаныя партыяй і ўрадам заданьні, зьвязаныя з уборкай ураджаю і асеньняй сяўбой.

Галоўнейшымі задачамі, якія стаяць перад партыйнымі арганізацыямі, зьяўляюцца:

а) усямернае гаспадарчае замацаваньне калгасаў, асабліва забясьпячэньне разьвіцьця жывёлагадоўлі, арганізацыі жывёлагадоўчых калгасных і савецкіх гаспадарак, пашырэньне плошчы саўгасаў, хутчэйшае вырашэньне кармавой праблемы, абавязковае засіласаваньне ў гэтым годзе 1 млн. тон корму, сваячасовая пабудова для гэтага неабходнай колькасьці ям, траншэй і вежаў.

б) Правядзеньне ўсіх мерапрыемстваў на павышэньне ўраджайнасьці ў асеньнюю сяўбу на 6—8 проц. па індывідуальным сэктары і на 8-10 проц. па сацыялістычным сэктары.

в) Пашырэньне азімага кліну на 4-5 проц. па індывідуальных гаспадарках і правядзеньне мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць пашырэньне пасеўнай плошчы па калгасах у 1930-31 г. на 14 проц. за кошт распашкі неасвоеных зямель і памяншэньня плошчы папару.

Для ажыцьцяўленьня гэтых асноўных задач, ЦК КП(б)Б прапануе правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. Раньні ўздым папару, пасеў гатункавым насеньнем, ачыстку і пратручваньне насеньня, радавы пасеў, заблеўую ўспашку, вапкаваньне і тарфаваньне глебы, поўнае скарыстаньне штучнага ўгнаеньня, забясьпячэньне с.-г. машынамі і рамонт машын, арганізацыю машына-конных станцый, забясьпячэньне разьвіцьця садоўніцтва і гароднічтва згодна зацьверджаных плянаў ураду.

2. АК і РК КП(б)Б да 30 чэрвеня г. г. склікаць раённыя партыйныя сходы, на якіх, апрача абгаварэньня пастаноў XIII зьезду КП(б)Б, дэталёва абгаварыць вынікі веснавой пасеўнай кампаніі і практычныя мерапрыемствы і пляны ўборкі ўраджаю і асеньняй сяўбы.

3. Правесьці шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў, калгасьніц і калгаснай моладзі, а таксама сярод бядняцка - серадняцкіх мас сялянства па пытаньнях уборкі ўраджаю і асеньняга пасеву, мабілізуючы гэтыя масы на правядзеньне ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі, разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і некалгасьнікаў - беднякоў і сераднякоў на лепшае правядзеньне ўборкі ўраджаю і азімага пасеву, шляхам арганізацыі ўдарных брыгад і спаборніцтва паміж імі на лепшае і хутчэйшае выкананьне работы.

4. Забясьпечыўшы сваячасовае і поўнае выкананьне заданьняў па ўборцы ўраджаю і асеньняй сяўбе ў калгасах і саўгасах, неабходна арганізаваць шырокую дапамогу з боку калгасаў і саўгасаў ваколічным бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам у правядзеньні ўборкі ўраджаю і азімага пасеву. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на правільную арганізацыю працы ў калгасах, на найбольш мэтазгоднае разьмеркаваньне рабочай сілы.

Калгасы і саўгасы, якія раней скончаць уборку ўраджаю і сяўбу, павінны найбольш хутка і сваячасова дапамагчы едстаючым па ўборцы і сяўбе калгасам і саўгасам, наладжваючы ўзаемную дапамогу. Аднэй з сур'ёзнейшых задач партыйных арганізацый зьяўляецца ўстанаўленьне правільных узаемаадносін паміж калгаснікамі і беднякамі і сераднякамі некалгаснікамі, памятаючы паказаньне зьезду на тое, каб «не цкаваць індывідуальнікаў, аказваць ім усякую дапамогу і прыцягваць у калгасы». У мэтах больш правільнага разьмеркаваньня рабочай сілы і скарыстаньня машын, уборку ўраджаю ў калгасьнікаў, якія маюць індывідуальныя палоскі, мэтазгодна праводзіць калектыўным раўдакам.

5. На падставе ўсіх вызначаных мерапрыемстваў па гаспадарчым замацаваньні калгасаў, і ў сапраўднасьці пабальшавіцку разгортваючы масавую работу сярод бядняцкага і серадняцкага насельніцтва вёскі, ліквідуючы перагібы і скрыўленьні лініі партыі ў справе калектывізацыі, неабходна забясьпечыць далейшае разгортваньне калектывізацыі бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак.

Партыйныя арганізацыі павінны кіравацца ленінскім прынцыпам у справе калектывізацыі, поўнасьцю захоўваць добраахвотнасьць і рашуча прасякаць спробы адміністрацыйных мэтадаў калектывізацыі.

Адначасова ўсе партыйныя арганізацыі павінны даваць бязьлітасны адпор панікёрскім і дэмабілізацыйным настроям, недаацэнцы дасягнутых посьпехаў у галіне калектывізацыі, якія на справе зьяўляюцца праявамі правага апартунізму.

6. ЦК КП(б)Б асабліва падкрэсьлівае важнасьць вытворчага каапэраваньня бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак. Неабходна ўмацніць арганізацыю прасьцейшых вытворчых таварыстваў (паляводчыя, жывёлаводчыя, садова-гароднія, птушкаводныя, трусаводныя, мэліяратыўныя і інш.).

ЦК КП(б)Б катэгарычна патрабуе ад усіх АК і РК КП(б)Б прыняць належныя меры да аднаўленьня і разгортваньня работы па арганізацыі вытворчых таварыстваў, аб'ядноючы ў іх тыя бядняцка - серадняцкія гаспадаркі, якія яшчэ не ўвайшлі ў калгасы.

7. Улічваючы вопыт правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі, ЦК КП(б)Б прапануе акругкомам КП(б)Б камандыраваць у раёны неабходную колькасьць адказных работнікаў і спэцыялістых для арганізацыі і дапамогі РК партыі ў пасьпяховым правядзеньні ўборкі ўраджаю і асеньняй пасеўнай кампаніі і зьвязанага з гэтым шырокага разгортваньня калектывізацыі і каапэраваньня батрацкіх, бядняцкіх і серадняцкіх мас сялянства.

8. Да правядзеньня ўборачнай і пасеўнай кампаніі трэба прыцягнуць шырокія рабочыя масы. Прафсаюзы і шэфскія таварыствы, па вопыту веснавой пасеўнай кампаніі, павінны арганізаваць дапамогу калгасам і індывідуальным бядняцка - серадняцкім гаспадаркам у выкананьні вызначаных заданьняў. Асноўнымі формамі ўдзелу рабочых у правядзеньні кампаніі зьяўляюцца: арганізацыя рабочых брыгад па рамонце с.-г. машын, дапамога кваліфікаванымі сіламі для работы на складаных машынах і г. д.

9. Асабліва важным мерапрыемствам, ад якога ў значнай ступені залежыць пасьпяховасьць правядзеньня асеньняй сяўбы і ўборачнай кампаніі, зьяўляецца правільнае разьмеркаваньне с.-г. машын па раёнах з тым, каб забясьпечыць сваячасовую ўборку ўраджаю і засеў. Неабходна забясьпечыць поўную нагрузку машын, іх сваячасовую зборку і дастаўку на месца работы. Кожная машына, скарыстаная ў адным месцы, павінна з максымальнай хуткасьцю перакідвацца ў другія калгасы, саўгасы і раёны. Таксама неабходна забясьпечыць хутчэйшы і бесьперабойны рамонт с.-г. машын.

ЦК зварачае асаблівую ўвагу ўсіх партыйных, савецкіх і гаспадарчых арганізацый на неабходнасьць практычнага ажыцьцяўленьня максымальнай нагрузкі сельска - гаспадарчых машын і прылад (згодна паказаньняў Наркамзему) у часе ўборкі ўраджаю і асеньняй сяўбы, адпаведна арганізаваўшы для гэтага рабочую сілу.

10. Неабходна арганізаваць сыстэматычнае асьвятленьне ў цэнтральным і мясцовым друку ходу падрыхтоўкі і правядзеньня ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі, бязьлітасна выкрываць усякія перашкоды на шляху пасьпяховай падрыхтоўкі і правядзеньня ўборачнай і пасеўнай кампаніі.

11. Для актыўнага ўдзелу ў падрыхтоўцы і правядзеньні пасеўнай і ўборачнай кампаніі трэба прыцягнуць камсамольскую арганізацыю, групы «лёгкай кавалерыі» — забясьпечыўшы з боку партарганізацыі належную дапамогу камсамолу і кіраўніцтва.

12. ЦК КП(б)Б заклікае ўсю партыйную арганізацыю да правядзеньня выразнай і яснай клясавай лініі партыі, даючы рашучы адпор кулацтву і змагаючыся з права - апартуністычнай тэорыяй і практыкай і «левымі» загібамі, забясьпечыць поўнае выкананьне паставленых задач, далейшае разгортваньне калектывізацыі і, на базе суцэльнай калектывізацыі, — ліквідацыю кулацтва, як клясы.

13. ЦК КП(б)Б будзе ацэньваць працаздольнасьць партыйных арганізацый у залежнасьці ад таго, наколькі пасьпяхова будзе праведзена ўборачная кампанія і асеньняя сяўба і наколькі будуць замацаваны існуючыя калгасы і ўцягнуты ў калгасы і вытворчыя таварыствы новыя масы батракоў, беднякоў і сераднякоў.

САКРАТАР ЦК КП(б)Б К. ГЕЙ.

Падрыхтаваць рабочую сілу

Праўленьні Белкалгасцэнтру і Белпаляводсаюзу запрапанавалі ўсім акруговым і раённым калгасна-каапэрацыйным саюзам зьвярнуць асаблівую ўвагу на забясьпячэньне надыходзячай уборачнай кампаніі рабочай сілай. Неабходна зараз-жа выявіць раёны і калгасы, у якіх будзе адчувацца недахоп у рабочай сіле і прыняць адпаведныя энэргічныя меры.

Трэба найбольш ушчыльніць рабочы дзень калгасьнікаў, поўнасьцю нагрузіць членаў, пырока скарыстаць ударніцтва і сацспаборніцтва. Побач з гэтым, трэба загадзя паклапаціцца аб прыцягненьні рабочай сілы ў тыя калгасы, дзе будзе адчувацца недахоп. У першую чаргу трэба выкарыстаць рабочую сілу навукольнага насельніцтва шляхам найму, або ў парадку ўзаемнай дапамогі (індывідуальныя гаспадаркі даюць калгасу рабочую сілу, замест гэтага калгасы дапамагаюць убраць хлеб, абмалаціць яго, ачысьціць насеньне і г. д.). Прапануецца ўстанавіць сувязь з саўгасамі і дабіцца дапамогі з боку апошніх, а таксама тых калгасаў, дзе ёсьць лішкі рабочай сілы.

С.-г. машыны павінны працаваць з поўнай нагрузкай

Пастанова НКЗему БССР

Народны Камісарыят Земляробства БССР устанавіў мінімальныя тэрміны работы с.-г. машын у часе ўборачнай і асеньняй кампаніі, у мэтах іх лепшага скарыстаньня.

Трактары павінны працаваць 16 гадзін у суткі, жнявяркі, снопавязалкі — ня менш 9 гадзін; жнявяркі - самаскідкі —ў лёпені 14 гадзін і ў жніўні — 12 гадзін; касаркі — ў лёпені 16 гадз. і ў жніўні — 14 гадз.; малатарні з рухавіком — у полі — у лёпені 16 гадз. і ў жніўні — 14 гадз., у сядзібе — у лёпені 18 гадз., у жніўні — 16 гадз. і ў верасьні — 14 гадзін.

Кантроль за правядзеньнем гэтай пастановы ўскладзены на Белсельтрэст і Белкалгасцэнтр.

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 16 чэрвеня

аб выніках росту партыі за першы квартал 1930 году і паляпшэньні партыйнай работы на прадпрыемствах

ЦК канстатуе, што за мінулы пэрыяд на падставе посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва народнае гаспадаркі, вялікага ўздыму папітычнай актыўнасьці рабочае клясы дасягнуты буйнейшыя посьпехі ў справе вярбоўкі рабочых у партыю. За першы квартал 1930 году ў партыю ўлілася 221 тысяча новых папаўненьняў, галоўным чынам з кадравага складу пралетарыяту і ў першую чаргу з буйных і буйнейшых прадпрыемстваў, прычым звыш аднэй трэцяй новых уступіўшых маюць дарэвалюцыйны вытворчы стаж.

У рэзультаце ўзмоцненага прыцёку рабочых у партыю значна палепшыўся яе сацыяльны склад. Удзельная вага рабочых з вытворчасьці ў партыі павысілася да 48,6 проц.

Значны зрух адбыўся таксама ў росьце вясковых партарганізацый, якія выраслі за мінулы пэрыяд на 13,4 проц. галоўным чынам за лік сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў, сялян-калгасьнікаў.

Адзначаючы дасягнутыя посьпехі і лічачы неабходным працягваць на аснове пастаноў 16 лютага 1930 г. узмоцненую работу па вярбоўцы рабочых у партыю, ЦК разам з тым адзначае зусім нездавальняючае выкананьне пасатноў ЦК «аб пашырэньні выхаваўчай работы з нанава ўступаючымі ў партыю»— ЦК лічыць, што пытаньні палітычнага выхаваньня членаў партыі, асабліва новапрынятых, у цяперашні час маюць выключна важнае значэньне.

ЦК прапануе мясцовым партарганізацыям арганізаваць для ленінскага закліку спэцыяльныя школы, дабіваючыся поўнага ахвату нова-ўступіўшых кандыдатаў вучобай на працягу летняга пэрыяду. Трэба таксама максымальна ўзмацніць перападрыхтоўку нізавых партыйных работнікаў (групоргі, сакратары цэх'ячэек і г. д), дзеля чаго абавязаць крайкомы, абкомы і ЦК нацкампартый разгарнуць на працягу летняга пэрыяду ў буйных раёнах, акруговых цэнтрах шырокую сетку спэцыяльных курсаў тэрмінам ня менш месяца.

Партарганізацыі на прадпрыемствах павінны стаць на чале і арганізаваць вялізарны ўздым творчай актыўнасьці пралетарыяту, мабілізуючы на аснове ўдарніцтва і сацспаборніцтва энэргію мас на выкананьне асноўных вытворчых заданьняў, ажыцьцяўляючы гэта ў першую чаргу жывым прыкладам камуністых і камсамольцаў, іх сапраўды камуністычнымі адносінамі да працы, узорам сапраўднай работы па-рэвалюцыйнаму. Перадавая кіраўнічая роля партыйца на прадпрыемстве павінна заключацца галоўным чынам у тым, каб кожны камуніст зрабіўся узорным рабочым на вытворчасьці.

У мэтах паляпшэньня работы ячэек перабудаваць нізавую партыйную сетку (група, зьвяно) паводле вытворчага прынцыпу (агрэгат, брыгада, перадзел), а таксама, разузбуйніўшы цэх'ячэйкі, надаць ім статутныя правы. Перайсьці да сыстэмы індывідуальных заданьняў для кожнага партыйца з пэрсанальнай адказнасьцю за выкананае даручэньне, прычым разьмеркаваньне партыйных сіл па асобных сэктарах (вучастках) работы рабіць у залежнасьці ад абстаноўкі і ўмоў работы, дабіваючыся найбольш гібкай рухомай сыстэмы сэктараў, колькасьць якіх не павінна перавышаць 7-8.

Уборачныя машыны і інвэнтар не завезены

ВОРША. (Наш кар.). Паводле пляну Аршаншчына павінна атрымаць да ўборачнай кампаніі 130 касарак, 120 конных грабель, 400 жнявярак, 250 тачыльных апаратаў, 1 бульбакапацель. На сёнешні дзень завезена: 47 касарак, 10 конных грабель, 220 жнявярак і 60 тачыльных апаратаў. Такім чынам, плян завозу ня выкананы.

Што-ж датычыцца ўборачнага інвэнтару — дык меркавалася завезьці 45.000 кос, і 15.000 сярпоў. Пакуль што завезена і разьмеркавана па раёнах толькі 36.000 кос і 5.000 сярпоў.

Бязьдзейнасьць і халадок

ВОРША. (Наш кар.). Апошнім планам сіласаваньня, які вызначаны для Аршанскай акругі, прадугледжваецца магатоўка 95.000 тон сіласу, з якіх 55.000 тон у калгасах, 20.000 тон у малочна-жывёлагадоўчых т-вах і 20.000 тон у індывідуальных гаспадарках. Такім чынам, неабходна пабудаваць усяго каля 1.000 сіласных ям, 8 якіх каля 750 у калгасах і мал. жыв. т-вах, акрамя таго, калгасы павінны паставіць 9 сіласных вежаў.

Плян сіласаваньня яшчэ не даведзены да раёнаў. Калі-ж у раёнах пачнецца практычная работа па ажыцьцяўленьні мерапрыемстваў па сіласаваньні — не вядома.

З 28 чэрвеня ў 11-ці пунктах акругі павінны былі адкрыцца курсы па сіласаваньні. Задача курсаў — прапусьціць 500 калгасьнікаў і саўгасных рабочых. Між тым, да сёнешняга дня яшчэ не зацьверджаны праграмы курсаў.

Трэба паогул сказаць, што ў Воршы адносяцца да сіласаваньня з халадком.

Сталінградзкі трактарны завод

...: выезд першага трактара

Калгас „Новы сьвет“ рыхтуецца па-ўдарнаму

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Калгас «Новы сьвет», Быхаўскі раён, пачаў падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі. Ужо складзены ўдарныя брыгады, якія паводле прыкладу правядзеньня веснавых палявых работ, уступаюць паміж сабою ў сацыялістычнае спаборніцтва. На сёнешні дзень калгас ужо выканаў частку пляну падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі. Ім адрамантаваны і прыведзены ў гатоўнасьць 3 жнявяркі, адна касарка, 4 малатарні, некалькі збожжаачышчальных машын і ільнамялак. Зараз прыступлена да падрыхтоўкі гумен і перавозачных сродкаў.

Зрыў сіласаваньня---удар па жывёлагадоўлі

Камсамол Беларусі не разгарнуў паходу па сілас.---Зямельныя і калгасна-каапэрацыйныя органы бязьдзейнічаюць

На фронце сіласу зруху няма

Тэмпы сяўбы сіласных культур, будаўніцтва сіласных вежаў і ям сыгналізуюць аб пагрозе зрыву ў радзе раёнаў і акруг нават самых мінімальных плянаў сіласаваньня. Па кукурузе і сланэчніку плян фактычна ўжо правалены. Наогул-жа плян васеву сіласных культур у калгасах выканаў ня больш, як на 25 проц. Пасоўныя раёны ня выкарысталі насеннага матар'ялу—Брагінскі, напрыклад, замест 16.000 клг. кукурузы пасеяў толькі каля 2.500 клг.

У Віцебскім раёне засталося ня выкарыстаным 25.000 клгр. кукурузы і 15 тон сланэчніку, у Полацку — 2 вагоны сланэчніку. Насеньне ня было своячасова разьмеркавана па калгасах.

Кожны гэктар засеяных сіласных культур садзейічае хутчэйшаму вырашэньню праблемы жывёлагадоўлі, між тым, вакол гэтага важнейшага пытаньня ня была мабілізавана думка калгасьнікаў, аграномаў, бядняцка - серадняцкіх мас, камсамолу. Буйныя камсамольскія ячэйкі саўгасаў і калгасаў, як Расінская і імя Калініна, Самахвалавіцкага раёну, нават, ня ведаюць, што такое сілас.

Мясцовыя арганізацыі, замест баявой работы, заняліся скарачэньнем заданьняў на сіласаваньні. **Бюро Попадкага акругкому камсамолу** наперакор устаноўцы ЦК ЛКСМБ пастанавіла пабудаваць у акрузе ўсяго 220 сіласных ям, пры наяўнасьці 300 камсамольскіх ячэек. На адну камсамольскую ячэйку прыпадае такім чынам, усяго тры чвэрці ямы, замест вызначаных дзесяткаў ям. Камсамольцы **Гомельшчыны** пайшлі яшчэ далей — яны зьнізілі заданьне да ½ ямы.

Магілёўскія акруговыя ўстановы — малажыцаюз, акрэа, акркалгассаюз не прынялі патрэбных мер да давядзеньня пляну сіласнага будаўніцтва да кожнага калгасу і бядняцка - серадняцкай гаспадаркі.

Бюро па сіласаваньні пры Наркамземе БССР бязьдзейнічае. Яно дагэтуль вічога практычнага не зрабіла, каб сапраўды зрушыць гэту справу з месца. **Белкалгасцэнтр** разаслаў па месцы агульны плян сіласаваньня. Ці дайшоў гэты плян да калгасу? — Невядома. Рэдома толькі тое, што амаль ні ў адным з калгасаў ня прыступілі да будаўніцтва траншэй і ям.

Калгасам-жа дано баявое заданьне — пабудаваць 1.800 ям і траншэй. Белкалгасцэнтр, аднак, не паклапаціўся даць месцам праекты і схэмы будаўніцтва простых ям. Наркамзем і Белкалгасцэнтр дагэтуль яшчэ не пераслалі ў калгасы плякатаў - праектаў тыпаў ям і траншэй.

На працягу цэлага месяца вялася пераписка з Саюзкалгасбудам аб тыпах сіласных вежаў. Дзесяткі раз праекты пераапрацоўваліся. Цяпер, калі значная частка часу для загатоўкі мясцовых будаўнічых матар'ялаў прапушчана, прышлі да выводу, што на дрэваапрацоўчым камбінаце ў Бабруйску можна прыступіць да першага ў Саюзе вопыту масавага выпуску стандартных вежаў. З камбінатам заключаны дагавор. Да 1-га жніўня павінна быць выпушчана 160 стандартных вежаў на 300 тон кожная. Аднак, тэмпы работы камбінату ў гэтай галіне не гарантуюць выкананьня заданьня.

Слова цяпер за **Бабруйскім камсамолам**, які павінен арганізаваць на камбінаце ўдарныя брыгады камсамольцаў і рабочай моладзі з тым, каб дабіцца выкананьня заданьня ў што-б ні стала.

Белкалгасбуд, на якім ляжыць задача пабудаваць фундаменты вежаў у калгасах, арганізаваць мясцовы транспарт для перавозкі вежаў да месца ўстаноўкі, забясьпечыць будаўніцтва рабсілай, не праяўляе адпаведных тэмпаў работы.

Толькі ўчора Белкалгасбуд вылучыў спэцыяльнага работніка па сіласным будаўніцтве. Работнікі Белкалгасбуду ўпэўнены, што будаўнічыя матар'ялы будуць, але на сёнешні дзень Белкалгасбуд зусім ня ведае, ці загатоўлены дзе-небудзь гэтыя матар'ялы.

Наркамзем, Белкалгасцэнтр, Белкалгасбуд мяркуюць адкрыцьце розных курсаў па падрыхтоўцы работнікаў па сіласаваньні. Наркамзем, нават, мяркуе прапусьціць праз курсы каля 1.000 калгасьнікаў, саўгасных рабочых і г. д. Але пакуль сіласнае будаўніцтва ў адносінах забясьпячэньня работнікамі зьяўляецца зусім забытым вучасткам.

Першыя вынікі паходу за сілас паказваюць, што зямельныя органы, калгасная сыстэма, камсамол яшчэ ня выканалі ўзятай на сябе баявой задачы па стварэньні ў БССР кармовай базы.

Трэба безадкладна ўзмацніць тэмп будаўніцтва сіласных траншэй і ям, арганізацыю курсаў па падрыхтоўцы кадраў.

Савецкая грамадзкасьць павінна патрабаваць ад дрэваапрацоўчага камбінату выкананьня заданьня па выпуску 160 сіласных вежаў да вызначанага тэрміну. Да 1-га жніўня калгасы павінны атрымаць гэтыя вежы.

Камсамол БССР на першым этапе паходу на сілас ня справіўся са сваёй баявой задачай. Камсамольскія арганізацыі павінны мабілізаваць усе свае сілы і энэргію для ліквідацыі прарыву на фронце барацьбы за сілас.

К. М.

Валакіта працягваецца

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Валакіта ў разгортваньні будаўніцтва і арганізацыі сьвіноводчых калгасаў у Магілеўшчыне працягваецца. Вакол гэтай важнейшай задачы грамадзкая думка яшчэ не мабілізавана. У радзе месц наглядаюцца злачынныя адносіны да выкананьня дырэктыў аб разьвіцьці сьвінагадоўлі.

Прыхаўшыя з раёнаў працаўнікі паведамляюць, што ў многіх мясцох значэньне арганізацыі сьвіноводчых гаспадарак калгасам не растлумачана і калгасьнікі паогул аб гэтым амаль нічога ня ведаюць. Спробы малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі ажыцьцявіць неабходныя канкрэтныя мерапрыемствы ў гэтай галіне не сустракаюць падтрыманьня з боку раённых арганізацый.

У акрузе павінна была быць арганізавана 81 сьвіноводчая гаспадарка ў калгасах. Ёсьць весткі, што 71 калгас ужо вызначаны пад такія гаспадаркі. Але-ж да будаўніцтва сьвінухоў прыступлена ўсяго ў 32 гаспадарках.

Трэба, аднак, падкрэсьліць, што тэмп будаўніцтва сьвінухоў таксама не гарантуе, што яны будуць гатовы ў тэрмін. Тое самае можна сказаць пра выкананьне пляну арганізацыі сьвіноводчых гаспадарак паогул. Вось некалькі яскравых прыкладаў. У Быхаўскім раёне трэба арганізаваць 9 сьвіноводчых гаспадарак, пабудаваць у іх 10 матачнікаў і 23 адкормачныя пункты. Ня гледзячы на тое, што ўсе гэтыя гаспадаркі поўнасьцю забясьпечаны ляснымі і іншымі матар'яламі, да будаўніцтва прыступлена толькі ў адным калгасе. Ні РВК, ні райкалгассаюз не аддаюць адпаведнай увагі гэтай справе.

У Лупалаўскім раёне вызначаныя пад сьвіноводчыя гаспадаркі 9 калгасаў таксама поўнасьцю забясьпечаны лесаматар'ялам, але да будаўніцтва прыступілі толькі 2-3 калгасы.

Між іншым, у **Лупалаўскім раёне РВК** самавольна зьменшыў плянавае заданьне аб пастаўцы сьвіней-матак да 1.200 замест 2.500, вызначаных акругай. У раёне ёсьць такія калгасы («Перамога», «Партызан»), якія самі выказалі згоду арганізаваць у сябе сьвіноводчыя гаспадаркі. Адпаведныя арганізацыі, аднак, зусім не рэагуюць на гэты факт і, нават, не абмяркоўваюць гэтай прапановы калгасаў. Між тым, наглядаюцца такія факты, калі зьнятыя з адкормачных пунктаў маткі чамусьці перадаюцца не ў сьвіноводчыя гаспадаркі, а ў калгасы, якія такіх гаспадарак не арганізуюць.

Дрэнна стаіць справа **ў Чаўскім раёне.** Тут паогул нічога ня робіцца. Ня толькі не распачата будаўніцтва сьвінухоў, але, нават, не загатаваны лесаматар'ял. І гэта ў той час, калі Чаўскаму раёну трэба арганізаваць 10 сьвіноводчых гаспадарак на 2.200 сьвіней-матак.

Яшчэ больш абураючае становішча **ў Крычаўскім раёне.** РВК і райкалгассаюз зусім ня выказваюць ніякай зацікаўленасьці да будаўніцтва сьвіноводчых гаспадарак. Тут ня прыступлена да будаўніцтва сьвінухоў і лесаматар'ялаў таксама няма. У выніку таго, што ніякай растлумачальнай масавай работы сярод калгасьнікаў ня было праведзена, 4 калгасы паогул адмовіліся ад арганізацыі ў сябе сьвіноводчых гаспадарак.

Побач з гэтым, неабходна адзначыць тыя раёны, якія вельмі энэргічна ўзяліся за справу і аддаюць шмат увагі пытаньню разьвіцьця сьвіноводзтва. Тут ужо дасягнуты пэўны зрух. У **Шклоўскім раёне,** напрыклад, было вызначана арганізаваць 7 сьвіноводчых гаспадарак. Усе яны ўжо фактычна стваравоцца: прыступлена да будаўніцтва, адбываецца арганізацыйная праца і г. д. На жаль, недахоп некаторых дэфіцытных матар'ялаў перашкаджае яшчэ шпарчэй разгарнуць тэмп будаўніцтва.

У Клімавіцкім раёне ўжо таксама прыступлена да будаўніцтва сьвінухоў. Патрэбны лесаматар'ял нарыхтаваны. Ва ўсіх сьвіноводчых калгасах вызначаны будаўнічыя камісіі, тэхнічны персанал.

Гаворачы аб укамплектаваньні сьвіноводчых гаспадарак матачным матар'ялам, трэба адзначыць, што з гэтай справай стаіць вельмі дрэнна ва ўсёй акрузе, нават, горш чым з будаўніцтвам. Патрэбны 20.000 сьвіней-матак. Колькі-ж іх ёсьць у калгасах нікому дакладна не вядома. Мяркуецца толькі, што ў калектывах павінна быць каля 2.360 сьвіна-матак. Акрамя таго, закантрактавана 230 сьвінаматак і 950 сьвінак.

Аднэй з асноўных прычын прарываў у справе камплектаваньня сьвіноводчых гаспадарак матачным матар'ялам трэба лічыць слабую ўвагу, якую ў гэтай справе ўдзяляюць мясцовыя арганізацыі.

Як і раней, кепска стаіць справа з пераводам крэдытаў у раёны на сьвіноводзтва. Замест 2.271.000 руб. **Белмалжывсаюзам** пераведзена Магілеўшчыне толькі 915.000 руб. Ёсьць тармазы з просоўваньнем крэдытаў з раёнаў непасрэдна ў гаспадаркі. **Чаўскі раён,** напрыклад, атрымаўшы крэдыты, да гэтага часу не пераўёў іх калгасам. Такія-ж факты адзначаюцца і па іншых раёнах.

Нельга прайсьці міма бязьдзейнасьці акрэа ў справе арганізацыі сьвіноводчых гаспадарак. Цікавы факт. У некаторых раёнах (Быхаўскі, Бялыніцкі, Шклоўскі) назіраюцца паасобныя выпадкі захворваньня сьвіней. Між тым, акрэа нічога ня ўжывае, каб папярэдзіць іх масавае захворваньне. Ветэрынарны нагляд у раёнах сьпіць.

А. С.

Барыкады ў Буко-зьвястун вялікіх рашучых баёў у Францыі

УСЁ БОЛЬШ РАЗГАРАЕЦЦА СТАЧАЧНЫ ПАЖАР

Поўны разгром правых рэнэгатаў на выбарах у Саксонскі ляндтаг

Перамога кампартыі, на выбарах у Саксоніі

БЭРЛІН, 23. Папярэднія вынікі выбараў у саксонскі ляндтаг наступныя: камуністычная партыя атрымала 355 тыс. галасоў (на выбарах у ляндтаг у 1929 г. —345 тыс., на выбарах у ляндтаг у 1928 г. — 381 тыс.), сацыял - дэмакраты — 871 тыс. (у 1929 г. — 923 тыс., у 1928 г. — 999 тыс.), брандлераўцы — 15 тыс. (на выбарах у ляндтаг у 1929 г. —22 тыс.), старыя сацыял - дэмакраты— 19 тыс. (1929 г. — 40 і 1928 г. — 35 тыс.), нацыянал - сацыялістыя (фашысты) — 377 тыс. (1929 г. — 134 тыс. і 1928 г. — 74 тыс.), дэмакраты — 84 тыс. (1929 г. — 115 тыс. і 1928 г. — 147 тыс.), гаспадарчая партыя — 276 тыс., народная партыя — 227 тыс. (1929 г. — 362 тыс. і 1928 г. 317 тыс.), нацыяналістыя —124 тыс. (1929 г. 212 тыс. і 1928 г. — 254 тыс.), саксонская сялянская партыя (так званая «сельскі люд») — 120 тыс. (1929 г. — 29 тыс. і 1928 г. — 141 тыс.), партыя народнага права — 44 тыс. (1929 г. — 70 тыс. і 1928 г. — 87 тыс.), народна - нацыянальная партыя — 39 тыс., хрысьціянска - сацыяльная — 57 тысяч.

У параўнаньні з леташнімі выбарамі камуністычная партыя выйграла 10 тыс. галасоў за кошт сацыял - дэмакратаў і брандлераўцаў. Сацыял - дэмакраты страцілі 59 тыс. галасоў, а брандлераўцы пацярпелі канчатковы разгром, страціўшы каля 8 тыс галасоў.

Самым характэрным момантам гэтага працэсу перагрупоўкі палітычных сіл зьяўляецца моцнае **зьніжэньне ўплыву сацыял - дэмакратыі** і іншых буржуазных партый і ўзмацненьне, з аднаго боку, уплыву камуністычнай партыі, а з другога — крайняга фашысцкага крыла буржуазнага лягеру (нацыянал - сацыялістыя).

Посьпех камуністычнае партыі тым больш значны, што ён дасягнуты, ня гледзячы на жорсткі тэрор фашыстых, дзяржаўнага апарату, прадпрыемцаў і рэфармісцкіх бюракратаў. Усё-ж вынікі ўчарайшых выбараў паказваюць, што працэс уцягненьня адыходзячых ад сацыял - дэмакратаў рабочых у камуністычную партыю яшчэ знаходзіцца ў стадыі разьвіцьця.

БАРЫКАДНЫЯ БАІ Ў БУКО

**ПАРЫЖ, 23. Наперакор забаронам, у раённым цэнтры Бэён паводле ініцыятывы бастуючых у Буко, быў скліканы МАСАВЫ МІ

XIII зьезд КП(б)Б

Калгасны рух і ўздым сельскай гаспадаркі

Даклад тав. М. М. Галадзеда

I. Уводзіны

Таварышы, паколькі ў папярэдніх дакладах і спрэчках па гэтых дакладах многія таварышы ўжо гаварылі па пытаньні калектывізацыі і ўздыме сельскай гаспадаркі (на тэму майго дакладу) і паколькі час майго дакладу рэгламантам абмежаваны толькі аднэй гадзінай (а ў мяне ёсьць жаданьне вытрымаць гэты рэгламант), таму я не магу ставіць сваёй мэтай спыняцца падрабязна на ўсіх пытаньнях, а спыняюся толькі на некаторых важнейшых палітычных пытаньнях, даўшы па іх прынцыповую ўстаноўку. Чаго я не пасьпею закрануць, мяне дапоўніць т. Рачыцкі.

Перад тым, як прыступіць да выкладаньня фактычнага матар'ялу па дакладу, я павінен падкрэсьліць, што наша партыя падагульвае на канфэрэнцыях і зьездах вынікі вельмі багатага зьместам пэрыяду сваёй працы. Упярэдыню ў гісторыі пралетарскай рэвалюцыі ў гэты пэрыяд так шырока і глыбока на практыцы ў масавым маштабе ажыцьцяўлялася лінія нашай партыі па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі. Усім ужо вядома, што мільёны і дзесяткі мільёнаў дробных і драбнейшых сялянскіх (бядняцка-серадняцкіх) гаспадарак перайшлі за апошні год на новыя аграмаджаныя вытворчыя адносіны ў сельскай гаспадарцы, бязьлітасна паламаўшы векавыя эканамічныя ўстоі і традыцыі, узгадаваныя вякамі на прыватнай уласнасьці. Мільённыя масы працоўнага сялянства пераходзяць на шлях арганізацыі буйнога сацыялістычнага зямляробства. Гэта сьведчыць аб тым, што мы знаходзімся на такім новым этапе разьвіцьця Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі ўжо пачала ажыцьцяўляцца на практыцы ў шырокім маштабе самая цяжкая і складаная задача — задача арганізацыі сацыялістычнага грамадзтва і сацыялістычнай вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы. Гэта значыць, мы пачалі ажыцьцяўляць задачу сацыялістычнага будаўніцтва на тым вучастку, які зьяўляецца самым цяжкім і які цяжка паддаецца сацыялістычнаму ператварэньню з прычыны сваіх спэцыфічных асаблівасьцяй.

Самая складаная задача пралетарскай рэвалюцыі заключалася і заключаецца ў перабоцы мільённых мас сялянства, у перабудове іх дробных і драбнейшых гаспадарак на буйныя аграмаджаныя гаспадаркі, у перабоцы «псыхалёгіі селяніна ў духу пралетарскага сацыялізму». (Сталін).

Ленін аб гэтым сказаў наступнае:

«Справа перабоўкі дробнага зямляўладальніка, перабоўкі ўсёй яго псыхалёгіі і навыкаў ёсьць справа, якая патрабуе пакаленьняў. Вырашыць гэтае пытаньне ў адносінах да дробнага зямлеўладальніка, аздаравіць, так сказаць, усю яго псыхалёгію зможа толькі матар'яльная база, тэхніка, ужываньне трактараў і машын у зямляробстве ў масавым маштабе, электрыфікацыя ў масавым маштабе».

Вось наша партыя на даным этапе разьвіцьця пралетарскай рэвалюцыі ўжо практычна ажыцьцяўляе гэту найцяжэйшую задачу «перабоўкі псыхалёгіі селяніна ў духу пралетарскага сацыялізму» праз арганізацыю новых сацыялістычных вытворчых адносін у вёсцы на базе калгаснага будаўніцтва.

II. Асноўныя вынікі калектывізацыі сельскай гаспадаркі БССР за апошні год

Прынцыповая палітыка нашай партыі ў адносінах да ператварэньня бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на сацыялістычны лад выражаецца ў наступным:

«Нашай агульнай задачай—казаў т. Ленін,—нашай агульнай мэтай зьяўляецца пераход да сацыялістычнай гаспадаркі, да калектыўнага зямляробства, да аграмаджанай апрацоўкі зямлі»

далей ён казаў.

«Чым далей ідзе пэрыяд будаўніцтва, тым больш ясным становіцца і для сялянства... што выхадам сапраўды моцным і набліжаючым масы сялянства да культурнага жыцьця, сапраўды ставячым іх у становішча роўнае з іншымі грамадзянамі, —гэтым выхадам зьяўляецца толькі грамадзкая апрацоўка зямлі» (т. 15, стар. 554--555).

Тав. Сталін, разьвіваючы гэтае палажэньне, казаў наступнае:

«Ці можна на працягу больш-менш доўгага пэрыяду часу базаваць савецкую ўладу і сацыялістычнае будаўніцтва на дзьвёх розных падставах — на падставе самай буйной і аб'яднанай сацыялістычнай прамысловасьці і на падставе самай раздробленай і адсталай дробна-таварнай сялянскай гаспадаркі? Не, ня можна. Гэта калі-небудзь павінна скончыцца поўным развалам усёй народнай гаспадаркі. Дзе-ж выхад? Выхад у тым, каб узбуйніць сельскую гаспадарку, зрабіць яе больш здольнай да накапленьняў, да пашыранай рэпрадукцыі і ператварыць такім чынам сельска-гаспадарчую базу народнае гаспадаркі. Але як яе ўзбуйніць? Для гэтага існуюць два шляхі. Існуе шлях КАПІТАЛІСТЫЧНЫ, які заключаецца ва ўзбуйненьні сельскай гаспадаркі праз насаджэньне ў ёй капіталізму, шлях, які вядзе да зубожаньня сялянства і да разьвіцьця капіталістычных прадпрыемстваў у сельскай гаспадарцы. Гэты шлях адкідаецца намі, як шлях несумяшчальны з савецкай гаспадаркай. Існуе другі шлях, шлях САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ, які заключаецца ў стварэньні калгасаў і саўгасаў, у сельскай гаспадарцы, шлях, які вядзе да аб'яднаньня дробных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектыўныя гаспадаркі, узброеныя тэхнікай і навукай і да выцісьненьня капіталістычных элемэнтаў з зямляробства. Мы стаім за гэты другі шлях. Або адзін шлях, або другі; або НАЗАД—да капіталізму, або НАПЕРАД—да сацыялізму. Ніякага трэцяга шляху няма і ня можа быць». (Прамова т. Сталіна на канфэрэнцыі аграрнікаў-марксыстых 7-XII 29 г.).

Вось гэта, таварышы, ёсьць асноўныя палажэньні марксызму-ленінізму ў адносінах да вёскі, да сельскай гаспадаркі і яе пераробкі на сацыялістычны лад.

Наша партыя пад кіраўніцтвам свайго ЦК УсеКП(б) непарушна стаіць на гэтых пазыцыях і з улікам канкрэтных умоў і абставін, нэўхільна і пасьлядоўна праводзіць у жыцьцё гэту палітыку на практыцы.

Гэтае агульнае марксыцка-ленінскае палажэньне пра арганізацыю сацыялістычнай гаспадаркі і пра перабоўку сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад вядома ўжо ўсёй партыі, вядома і шырокім працоўным масам, але чго неабходна часьцей напамінаць таму, што правыя апартуністы і іх памочнікі «левыя» загібшчыкі, якія дапусьцілі на практыцы скажэньні лініі партыі ў справе калектывізацыі і якіх партыя прызвала да парадку, патрабуючы выпраўленьня дапушчаных памылак, — імкнуцца разьвесьці хлусьлівую «тэорыю» аб тым, што нібыта партыя адступае назад ад сацыялістычнай перабоўкі сельскай гаспадаркі на базе калектывізацыі.

Нам трэба паўтараць гэтыя асноўныя палажэньні марксызму-ленінізму таму, каб даць належны адпор правай і «левай» хлусьні аб якімсьці адступленьні партыі ў справе калектывізацыі; хлусьні, якою апартуністы хочуць апраўдаць дапушчаныя на мясцох памылкі і скажэньні ў справе калектывізацыі, апаганьваючы генэральную лінію нашай партыі.

Нашай партыі і пралетарыяту за гады існаваньня пралетарскай дыктатуры ўдалося стварыць ужо такія матар'яльныя і тэхнічныя ўмовы (аб чым гаварыў тав. Ленін), якія даюць поўныя падставы для таго калгаснага руху бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, які мы мелі за апошні год, асабліва ў збожавых раёнах.

Праводзячы ленінскую палітыку індустрыялізацыі, мы змаглі тым самым падвесьці тэхнічную і індустрыяльную базу пад рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і гэтым індустрыяльным вагаром падцягнуць мільёны бядняцка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарак на шляху пераходу ад раздробленай сельскай гаспадаркі да буйнага сацыялістычнага зямляробства.

Я ня буду падрабязна прыводзіць фактаў супраціўленьня лініі партыі, пералічу толькі тыя арганізацыі, дзе яны найбольш яскрава выразіліся. Такімі арганізацыямі зьяўляліся Шклоўскі райком, Рагачоўскі, Крычаўскі, Дубровенскі і г. д., дзе артыкул тав. Сталіна хаваўся ад сялянства, дзе ён абгаворваўся і кваліфікаваўся, як няправільны артыкул, дзе выносіліся нават і пастановы аб тым, што тав. Сталін сваімі артыкуламі нібыта зрывае калектывізацыю.

Вось у гэтых, а таксама і яшчэ ў радзе іншых арганізацый і з боку паасобных членаў КП(б)Б было шмат апартуністычных выхадак, якія зьяўляліся самым яскравым выражэньнем правага апартунізму пад прыкрыцьцём «левых» фраз.

Па ўсіх гэтых супраціўленьнях лініі партыі і па ўсіх гэтых апартуністычных па сутнасьці вылазках супроць лініі партыі ў справе калектывізацыі, супроць выпраўленьня дапушчаных на мясцох перагібаў ЦК КП(б)Б ударыў самым рашучым чынам, уключна да роспуску раду арганізацый, да зьняцьця з працы кіруючых працаўнікоў і г. д.

Як-жа зараз абстаіць справа з выпраўленьнем памылак? У асноўным іх шкоднасьць зразумелася ўсёй КП(б)В, але яны яшчэ ня зжыты. Ёсьць і яшчэ ў радзе месц скрытыя адміністраваньне і заціск. Аб гэтым мы павінны сказаць адкрыта ад імя зьезду перад усёй КП(б)Б. Гэтае адміністраваньне ў першую чаргу выяўляецца ў тым, што, напрыклад, пры адводзе яравога кліну і сенажаці многія савецкія і партыйныя арганізацыі ставяць індывідуальнага селяніна-бедняка і серадняка ў такія ўмовы, што ён або павінен ехаць за 3 вёрст араць, або павінен увайсьці ў калгас, бо ім прабуюць даць зямлю або на далёкай адлегласьці, або даць такую, якая раней пуставала, напрыклад, выганы, вучасткі, адрэзаныя ад шляхоў зносін, ваданоэў і г. д.

Гэтыя факты простага адміністраваньня пры адводзе зямлі пад яравы клін і сенажаці, якія нагледаліся ў апошні час, па-мойму, зьяўляюцца самым яскравым прыкладам таго, што яшчэ дагэтуль на многіх мясцох ня зжыты элемэнты адміністраваньня пры калектывізацыі. Наша задача заключаецца ў тым, што нам трэба абвясьціць самую бязьлітасную барацьбу рэшткам гэтых перагібаў, бязьлітасна выкрываць тых людзей, якія ня выправілі дапушчаных памылак, выкрываць іх, як непаправаных апартуністых, ужываючы да іх меры ўзьдзейства ўключна да выключэньня з радоў партыі.

Апрача гэтага, у радзе працаўнікоў можна наглядаць і такія факты, як упадніцтва, недаацэнка посьпехаў калектывізацыі, апусканьне рук, наліўнасьць тэорыі «самацёку» ў справе калектывізацыі. У радзе месц працаўнікі пачынаюць тлумачыць барацьбу нашай партыі за генэральную лінію, барацьбу са скажэньнямі гэтай лініі і дапушчанымі перагібамі, як адступленьне ад калектывізацыі, як перагляд партыйнай лініі ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі на базе калгасаў. З гэтым трэба таксама бязьлітасна змагацца, бо такія яўна апартуністычныя настроі падрываюць веру ў далейшыя посьпехі калектывізацыі, дэмабілізуюць волю партыі ў справе замацаваньня дасягнутых посьпехаў і каб, замацаваўшы існуючыя калгасы, зрабіўшы іх сапраўды прыкладамі сацыялістычнага зямляробства для ўсіх пакуль што не ўвайшоўшых у калгасы бедняко ў і серадняко ў, пасунуцца далей да суцэльнае калектывізацыі.

Трэба адзначыць, што гэтыя зьявішчы і настроі зьяўляюцца бязумоўнымі прыкладамі ясна выражанага правага апартунізму. Іменна адсюль вынікаюць імкненьні правых і «левых» узваліць адказнасьць за памылкі месц на плечы ЦК і дыскрэдытаваць наша партыйнае кіраўніцтва. Задача КП(б)Б заключаецца ў тым, каб павесьці самую бязьлітасную барацьбу з гэтымі апартуністычнымі імкненьнямі — узваліць памылкі на плечы ЦК і не дазволіць паганіць правільную генэральную лінію ЦК УсеКП(б), усёй партыі.

Тэорыі «самацёку» трэба супроцьставіць выразную і яскравую ўстаноўку на далейшую калектывізацыю. Наша партыя ніколі не адмаўлялася і ня будзе адмаўляцца ад асноўных прынцыпаў ператварэньня сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад і ад ажыцьцяўленьня гэтага прынцыпу на практыцы, ніколі не адмаўлялася ад кіраўніцтва калгасным рухам, але заўсёды патрабавала і будзе патрабаваць ад усіх членаў партыі сур'ёзнага падыходу да гэтай важнейшай справы і будзе весьці рашучую барацьбу з усякімі адступленьнямі ад асноўных ленінскіх прынцыпаў у справе калектывізацыі.

Аб ролі сельсаветаў у справе калектывізацыі

За адно я хацеў сказаць некалькі слоў і аб ролі сельсаветаў у справе калектывізацыі. У працэсе працы па калектывізацыі выявілася, што сельсаветы, як асноўныя органы пралетарскай дыктатуры на вёсцы, слабы прымалі ўдзел у кіраўніцтве калектывізацыяй. Тут ужо аб гэтым часткова гаварылася ў дакладах ЦК. Да гэтага я хачу дадаць, што слабы ўдзел сельсаветаў у справе калектывізацыі тлумачыцца ня толькі слабасьцю саміх сельсаветаў, а яшчэ і тым, што на мясцох у радзе выпадкаў была бязумоўна недаацэнка з боку раду партыйных арганізацый ролі сельсаветаў у ператварэньні сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад. Па-мойму, бясспрэчным зьяўляецца тое, што ў гэтых выпадках была падмена сельсаветаў партыйнымі і нават камсамольскімі ячэйкамі, а былі і такія выпадкі, калі райвыканкомы падмяняліся райкомамі. Замест узмацненьня кіраўніцтва саветамі з боку партыйных арганізацый у радзе выпадкаў саветы падмяніліся. Напрыклад, у правядзеньні раскулачваньня брыгады і паасобныя камуністыя і камсамольцы замянялі сельсаветы, а сельсаветы стаялі ў баку ад гэтай важнейшай справы.

Недаацэнка ролі сельсаветаў і іх падмена ва многіх выпадках праявілася яшчэ ўвосень мінулага году, калі некаторымі таварышамі высоўвалася думка ліквідацыі сельсаветаў і замена іх праўленьнямі калгасаў. Гэтым настроям быў дан своячасова самы бязьлітасны адпор, як настроям, якія цалкам супадаюць з ідэямі Мілюковых і сацыял-дэмакратаў, якія ў свой час у барацьбе супроць савецкае ўлады выкідвалі лёзунг «саветы без камуністых» і г. д., г. зн. лёзунг простага паспабленьня пралетарскай дыктатуры. На жаль, некаторыя нашы працаўнікі зьбіліся на гэтыя пазыцыі.

З гэтых памылак многіх арганізацый мы павінны зрабіць належны урок. Наша задача — узмацніць кіраўніцтва савецкім апаратам наогул, узмацніць кіраўніцтва сельсаветамі. Гэта адна з асноўных і галоўных задач палітыкі нашай партыі. Узмацняючы кіраўніцтва саветамі, у той-жа час павесьці працу так, каб не падмяняць партыйнымі і камсамольскімі ячэйкамі гэтых органаў пралетарскай дыктатуры ў вёсцы.

Аб працы з беднатой і клясавай барацьбе на вёсцы

З другіх важнейшых пытаньняў я хачу перад зьездам паставіць яшчэ пытаньне аб працы з беднатой і аб тых працэсах клясавай барацьбы, якія наглядаюцца на вёсцы. Наша партыя «на падставе разгортваньня суцэльнай калектывізацыі ў радзе раёнаў СССР перайшла ад ранейшай палітыкі абмежаваньня і выцісьненьня капіталістычных элемэнтаў у вёсцы да новай палітыкі —ліквідацыі кулацтва, як клясы, ажыцьцяўляючы гэтую палітыку, як непарушную і неадымную частку суцэльнай калектывізацыі, якая праводзіцца самімі бядняцка-серадняцкімі масамі».

Ажыцьцяўленьнем гэтае палітыкі нашай партыі на практыцы мы ўжо сталі на шлях ліквідацыі клясаў. Але гэта задача гістарычна вялікая і цяжкая, яна ня можа быць вырашана адным узмахам. Толькі ва ўпартай і жорсткай клясавай барацьбе ліквідуюцца клясы. Мы зрабілі толькі першы ды яшчэ і невялікі крок у гэтай справе.

Ленін па гэтым пытаньні казаў наступнае:

«Сацыялізм ёсьць зьніштажэньне клясаў. Дыктатура пралетарыяту зрабіла для гэтага зьніштажэньня ўсё, што магла, але адразу зьніштожыць клясы нельга. Клясы засталіся і застануцца на працягу эпохі дыктатуры пралетарыяту. Дыктатура будзе непатрэбна, калі зьнікнуць клясы. Яны ня зьнікнуць без дыктатуры пралетарыяту. Клясы засталіся, але кожная відазьмянілася ў эпоху дыктатуры пралетарыяту; зьмяніліся і іх узаемаадносіны. Клясавая барацьба ня зьнікае пры дыктатуры пралетарыяту, а толькі набывае іншыя формы».

Гэтае вучэньне Леніна аб клясавай барацьбе адначасова зьяўляецца і адказам правым апартуністым, якія разьвіваюць супроцьленінскую тэорыю «аб урастаньні кулака ў сацыялізм», падмяняючы гэтай тэорыяй клясавую палітыку нашай партыі, асна ваную на ленінізьме.

У сувязі з праведзеным раскулачваньнем некаторымі таварышамі ставіцца так пытаньне: ці ня зьменшылася ці ня зьмякчылася клясавая барацьба на вёсцы, паколькі частка кулакоў ужо раскулачана, пазбаўлена сродкаў эксплёатацыі (сродкаў вытворчасьці) і што ў сувязі з гэтым і праца з беднатой не павінна весьціся. Такія разважаньні палітычна зусім памылковыя і няправільныя. Клясавая барацьба на вёсцы ня зьменшылася, а абвастрылася, яна і далей будзе абвастрацца. Кулак яшчэ канчаткова не ліквідаваны, ён будзе аказваць самае яраснае супраціўленьне нашаму сацыялістычнаму наступленьню. Ён (кулак) выкарыстоўвае адліў з калгасаў, выкарыстоўвае дапушчаныя нашымі арганізацыямі перагібы і памылкі ў дачыненьні да серадняка, дзеля таго, каб аўладаць серадняком і супроцьставіць не калгасную беднату і серадняка калгаснаму сэктару, які (калгасны сэктар) зьяўляецца сапраўднай і моцнай апорай савецкае ўлады на вёсцы.

Ленін, гапорачы аб барацьбе клясаў пасьля зьвяржэньня буржуазіі, казаў наступнае:

«Энэргія супраціўленьня іх узрасла іменна дзякуючы іх паражэньню, у сотні, тысячы раз... Клясавая барацьба скінутых эксплёататараў супроць перамогшага авангарду эксплёатуемых, г. зн. супроць пралетарыяту, стала нязьмерна больш жорсткай, і гэта ня можа быць інакш, калі гаварыць аб рэвалюцыі, калі не падмяняць гэтага разуменьня... рэфармісцкімі ілюзіямі». (т. 16, ст. 254 —«Эканоміка і палітыка ў эпоху дыктатуры пралетарыяту»).

Гэтае палажэньне Леніна аб абвастрэньні клясавай барацьбы цалкам і поўнасьцю адпавядае сучаснаму становішчу клясавай барацьбы на вёсцы і пасьля таго, як мы кулаку нанесьлі вялізарнае паражэньне. Кулак, пацярпеўшы паражэньне, павялічвае сваё супраціўленьне. Таму і разважаньні аб паслабленьні клясавай барацьбы на вёсцы — гэта ёсьць разважаньні супроцьленінскія, якія ня могуць мець месца ў радох нашай партыі.

Асноўным пытаньнем у барацьбе з кулаком у вёсцы на даным этапе павінна быць устанаўленьне зусім правільных узаемаадносін калгасаў з некалгасным беднатой і серадняком, не ўвайшоўшых пакуль што ў калгас, або выхаўшых з калгасу. Гэтым мы павінны ўзмацніць згуртаванасьць калгасьнікаў з некалгаснай бядняцка-серадняцкай масай. Таму тэзісамі ЦК УсеКП(б) гэтае пытаньне ставіцца зусім выразна і яскрава: «не цкаваць індывідуалаў — гаворыцца ў тэзісах, — а аказваць ім дапамогу і ўсяляк прыцягваць да калгасу.

Дабіцца гэтага можна ў першую чаргу праз паляпшэньне працы з беднатой, праз ажыўленьне дзейнасьці груп беднаты, праз паляпшэньне працы ўсіх партыйных, савецкіх, каапэрацыйных і грамадзкіх арганізацый на вёсцы, устанаўленьне ў іх дзейнасьці выразнай, зусім яснай клясавай пралетарскай лініі, дабіўшыся правільных адносін да беднаты і серадняка некалгаснага сэктару, паляпшэньне іх абслугоўваньня як з боку ўсіх арганізацый вёскі, так і з боку саміх калгасаў.

Ленін аб гэтым казаў наступнае:

«Бязумоўны абавязак усякага прадпрыемства таварыскага, арцельнага зямляробства — не абасабляецца, не адмяжоўвацца ад вакольнага сялянскага насельніцтва, а абавязкова аказваць яму дапамогу. У законе гэта напісана, у камунальных статутах гэта паўторана... і гэта самае галоўнае. Але ўся справа ў тым, каб знайсьці сапраўдны практычны парадак, як прыстасаваць гэтае да жыцьця. Тут у мяне няма яшчэ ўпэўненасьці ў тым, што мы гэтую галоўную цяжкасьць перамаглі». (Прамова на 1-м зьезьдзе камун і с.-г. арцеляй 3-XII 20 г., т. 16, стар. 392—393).

Гэта ўстаноўка Ўладзімера Ільліча Леніна і сёньня набывае сваё актуальнае значэньне, калі, як галоўнае ва ўзаемаадносінах калгаснага сэктару з індывідуаламі, у тэзісах ЦК УсеКП(б) ставіцца пытаньне наладжаньня гэтых правільных узаемаадносін.

З раней сказанага відаць, што клясавая барацьба на вёсцы не зьмяншаецца, а наадварот у розныя пэрыяды будзе прымаць усё больш абвостраныя формы.

Адсюль важнейшая задача партыі ў некалькі раз узмацніць працу з беднатой, галоўным чынам у некалгасным сэктары, наблізіць бедняка і серадняка некалгасьніка да калгасу, ударыць па імкненьнях кулака, які імкнецца нацкаваць некалгасьніка супроць калгасьніка, устанавіць правільныя ўзаемаадносіны з некалгасным сэктарам — гэта адна з баявых і важнейшых задач нашай партыі.

Заадно я хачу сказаць — ці здымаецца задача працы з беднатой у калгасах? Пасьля паяўленьня тэзісаў ЦК УсеКП(б), дзе гаворыцца, што зараз пановаму ставіцца задача апоры савецкай улады на вёсцы, што асноўнай апорай савецкай улады на вёсцы зараз зьяўляецца ў збожавых раёнах, дзе калектывізавана 50-60 проц. сялянства, зьяўляюцца кальгасьнікі, то некаторыя таварышы ставяць так пытаньне — «як - жа быць з працай з беднатой у калгасах, мабыць, яе зусім ня трэба весьці, калі ў тэзісах напісана, што ўсе калгасьнікі зьяўляюцца асноўнай апорай савецкай улады ў вёсцы?»

Таму я хачу іменна па зьезьдзе паставіць гэтае пытаньне — ці здымаецца задача працы з беднатой у калгасах? Па-мойму, ні ў якім разе ня здымаецца на даным этапе калгаснага будаўніцтва, у нас, у БССР тым больш паколькі калгасы ў сваёй большасьці толькі што арганізаваліся, паколькі процант калектывізацыі гаспадарак яшчэ невялікі, паколькі барацьба кулацтва за расхістваньне калгасаў будзе весьціся самым жорсткім чынам, — таму нам трэба мець у калгасах стойкае ядро ў першую чаргу з беднаты, для перавыхоўваньня і тых калгасьнікаў-серадняко ў, якія яшчэ пакуль што часамі хістаюцца.

Тав. Сталін аб калгасах гаварыў наступнае:

«Вядома ўсім, што калгас, як тып гаспадаркі, ёсьць адна з форм сацыялістычнай гаспадаркі. У гэтым ня можа быць ніякага сумненьня»...

А вы ведаеце, таварышы, то тып гаспадаркі акрэсьліваецца адносінамі людзей да вытворчасьці, а ў калгасах асноўныя сродкі вытворчасьці абагулены, ясна, што ў калгасах перастае існаваць прыватная ўласнасьць на асноўныя сродкі вытворчасьці, а гэта і акрэсьлівае іх па тыпе, як адну з форм сацыялістычнай гаспадаркі.

Далей т. Сталін гаварыў:

«Зразумела, у калгасах ёсьць і супярэчнасьці, у калгасах ёсьць індывідуалістычныя і нават кулацкія перажыткі, якія яшчэ не адпалі, але якія абавязкова павінны адпасьці з цягам часу па меры ўмацаваньня калгасаў, па меры іх машынізацыі».

Аб клясавай барацьбе ў калгасах тав. Сталін гаворыць наступнае:

«Ці ёсьць элемэнты клясавай барацьбы ў калгасах? Так, ёсьць. Ня можа ня быць элемэнтаў клясавай барацьбы ў калгасах, калі там захоўваюцца яшчэ перажыткі індывідуалістычнай і нават кулацкай псыхалёгіі, калі там ёсьць яшчэ некаторая няроўнасьць».

Значыць, з гэтага відаць, што элемэнт клясавай барацьбы ў калгасах яшчэ застаецца, супярэчнасьці адначасна з арганізацыяй калгасаў не ліквідуюцца. Толькі нельга ня бачыць розьніцы паміж клясавай барацьбой у некалгасным сэктары і ўнутры калгасаў, бо тут ёсьць розьніца вялікая. Элемэнты клясавай барацьбы ў калгасах азначаюць перш за ўсё, што кулак разьбіт, што ў яго экспрапрыяваны сродкі вытворчасьці, што асноўныя сродкі вытворчасьці ў калгасах ужо абагулены, дзе засталіся толькі ў некаторых калгасьнікаў перажыткі індывідуалістычнай, а часамі кулацкай псыхалёгіі. У некалгасным сэктары клясавая барацьба азначае барацьбу за ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, барацьбу за экспрапрыяцыю сродкаў вытворчасьці кулака, дзе гэта задача яшчэ ня выканана. У гэтым асноўная розьніца клясавай барацьбы ў некалгасным сэктары і ўнутры калгасаў.

Элемэнты клясавай барацьбы і супярэчнасьці ў калгасах тым хутчэй будуць зжыты, чым хутчэй будуць машынізаваны і трактарызаваны калгасы.

У сваім адказе на пытаньне сьвядоўцам т. Сталін казаў наступнае:

«Што датычыць бедняка і серадняка ў калгасах, то па меры машынізацыі і трактарызацыі калгасаў, яны будуць зьлівацца ў адзіны атрад працаўнікоў калектывізаванай вёскі, адпаведна гэтаму павінны і дуць зьнікнуць у будучым у наш пёзунгах разуменьні «серадняк» «бядняк».

Значыць, т. Сталін гаварыў, што аяднаньне бедняка і серадняка ў адзін атрад працаўнікоў калектывізаванай вёскі будзе адбывацца ў будучым меры машынізацыі і трактарызацыі калгасаў. Гэтай формулы т. Сталіна ніко ня трэба забываць.

Таму, пакуль гэтых асноўных ум (поўная машынізацыя і трактарызацыя) у нас яшчэ няма, мы павінны в сьці працу з беднатой у калгасах, гу тоўваць з яе больш стойкіх і ад калгасьнікаў і праз гэту працу з беднатой усё больш і шырэй, чым гэта зы да гэтага часу уцягваць серадняко калгасьнікаў у кіраўніцтва калгасам у справу наладжаньня гаспадарча жыцьця калгасаў і г. д.

Прычым, праводзячы працу з беднатой у калгасах, ня трэба процістаўляць калгаснаую беднату серадняку-калгасьніку, а наадварот, праз працу з беднатой паскорыць злучэньне беднаты серадняком-калгасьнікам у адзіную калгасную сям'ю, дабівацца хутчэйшага зьлічэньня старых індывідуалістычных перажыткаў паасобных калгасьнікаў. Па-мойму толькі так трэба разумець гэтае пытаньне.

Узмацніць саўгасы

Я хачу яшчэ спыніцца на пытаньні аб узмацненьні і пашырэньні саўгасаў. Падрабязна гэтага пытаньня я растлумачыць ня буду, скажу толькі, што нашы саўгасы за гэты год таксама значна ўзмацніліся, плошча пад імі таксама пашырылася.

Пры пашырэньні і ўзмацненьні саўгаснага будаўніцтва было таксама дапушчана многа памылак і перагібаў, якія вынікалі з асноўных памылак дапушчаных па калектывізацыі. Мы мелі такія выпадкі, калі, напрыклад, у Полацкай акрузе вынесьлі пастанову, у якой гаварылася, каб значную частку сялянскай зямлі, якая знаходзіцца ў працоўным карыстаньні сялянства, перадаць саўгасам, запрапанаваўшы серадняком і бедняком перайсьці рабочымі ў саўгас. Мы скасавалі гэту пастанову, як толькі даведаліся аб ёй, лічачы, што сёньня серадняка і нават бедняка, у якога яшчэ засталіся перажыткі індывідуалістычнай псыхалёгіі, зрабіць ужо рабочым саўгасу і прымусіць цалкам адмовіцца ад сваёй гаспадаркі, пазбавіцца ад кавалачка зямлі, на якім ён працуе, які яму дала дзяржава, гэта азначае зрабіць грубейшую палітычную памылку, бо добраахвотна ён гэтага ня зробіць сёньня, такіх добравольцаў кінуць гаспадарку і пайсьці рабочымі ў саўгас знойдзецца яшчэ ня многа. Мы скасавалі гэту пастанову, хоць полацкія таварышы доўга не разумелі сваёй памылкі, даказваючы нам, што быццам самі сяляне вынесьлі такую пастанову, каб пакінуць свае гаспадаркі і пайсьці рабочымі ў саўгас. На справе-ж аказалася, што яны ня толькі не пайшлі рабочымі ў саўгас, але нават і той калгас, у які яны запісаліся, разваліўся. Значыцца, з гэтага боку відаць, што і пры ўзмацненьні і пашырэньні саўгасаў былі таксама дапушчаны памылкі. За апошнія гады мы мелі значна дасягненьне ў працы саўгасаў і ўзмацненьне іх вядучай ролі, як прадпрыемстваў пасьлядоўна-сацыялістычнага тыпу сельскай гаспадарцы (што ўжо ўсім па вядома), павінны адыгрываць вядучую ролю ў ператварэньні сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад. На жаль яшчэ ня ўсе саўгасы выконваюць гэту задачу. Некаторыя саўгасы яшчэ не зьяўляюцца вядучымі прадпрыемствамі ў адносінах да індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а ты больш да калгасаў. Многія саўгасы яшчэ не адыгрываюць вядучай ролі на спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі ў тым напрамку, у якім яны самі павінны разьвівацца. На гэту задачу зьезду прыдзецца зьвярнуць максымальную ўвагу і паставіць яе, як адну з асноўных задач перад усёй КП(б)Б. Удзельная вага саўгасаў у сельскай гаспадарцы БССР павялічылася, іх роля ў сувязі з гэтым таксама павялічваецца, але гэта роля будзе пастаўлена цалкам у простую залежнасьць ад росту і ўзмацненьня ўнутранога становішча саўгасаў. Таму неабходна максымальную ўвагу сканцэнтраваць на паляпшэньні працы саўгасаў, на ўзмацненьні іх вядучай ролі, як прадпрыемстваў пасьлядоўна сацыялістычнага тыпу ў сельскай гаспадарцы. Барацьба з недахопамі ў практычнай працы саўгасаў — гэта адна з першачарговых задач кожнага члена КП(б)Б.

Папярэднія вынікі пасеўнай кампаніі, падрыхтоўка да ўборачнай і асеньняй кампаніі

Тыя весткі, якія мы маем пра ажыцьцяўленьне пляну веснавой пасеўнай кампаніі, гаворадь нам аб тым, што веснавая пасеўная кампанія ў асноўным закончаецца прыкладна ў межах тых плянаў, якія намі вызначаны, і што іх недавыкананьне, калі яно і будзе, дык невялікае. Ёсьць пэўная надзея на тое, што мы плян веснавой пасеўнай кампаніі выканаем цалкам.

Самым балочным месцам у пасеўнай кампаніі гэтай вясны зьяўляецца пытаньне засеву тэхнічных культур. Тут справа абстаіць зусім дрэнна з пасевам канапель і ільну. Мы нядаўна апублікавалі пастанову СНК, у якой падвялі вынікі пасеву ільну і канапель да гэтага часу. Аказваецца, што плян пасеву гэтых культур выкананы толькі на 55 проц., кантрактацыя-ж іх выканана толькі ўсяго на 35 проц. Таварышы, я павінен з усёй сілай падкрэсьліць перад зьездам, што калі мы правалім плян засеву тэхнічных культур (а такая пагроза ёсьць, як рэальная пагроза), дык мы апынемся перад скандалам на ўвесь Савецкі Саюз, бо БССР зьяўляецца якраз адным з асноўных раёнаў па разьвіцьці тэхнічных культур — ільну і канапель. У гэтых адносінах ЦК УсеКП(б) і саюзны ўрад будуць прадпрымаць да нас сур'ёзныя запатрабаваньні, прыкладна ў такім-жа выглядзе, у якім яны прадпрымаюць да збожжавых раёнаў у справе вырашэньня збожжавай праблемы.

Так што, таварышы, у нас засталося яшчэ некалькі дзён, якія трэба выкарыстаць для правядзеньня пасеву ільну і канапель. Трэба баявым парадкам завінціць усе арганізацыі на гэту справу, каб выкарыстаць рэшту часу, што засталося для поўнага выкананьня пляну засеву тэхнічных культур. Трэба тос-ж самае зрабіць у справе кантрактацыі. З кантрактацыяй ільну мы можам праваліцца, асабліва ў індывідуальным сэктары. У апошнія дні мы кінулі некалькі мануфактуры для гэтай справы, павялічылі нормы продажу яе на закантрактаваны гэктар, але трэба ўсе арганізацыі самым баявым чынам, як на ваенным фронце, паставіць на ногі, для скарыстаньня дзён, што засталіся на засеў ільну і канапель, для правядзеньня кантрактацыі, не дапусьціўшы зрыву гэтага пляну. Гэта баявая апэрацыйная задача, якая стаіць перад усёй КП(б)Б, бо гэта для нас у разьвіцьці сельскай гаспадаркі адна з галоўнейшых задач.

Аб стане сельска-гаспадарчай каапэрацыі

Я ня буду спыняцца падрабязна на гэтым пытаньні, бо мы ў тэзісах, якія раздалі дэлегатам зьезду, даем досыць поўную і рэзкую характарыстыку гэтага пытаньня. Скажу толькі, што сельска - гаспадарчая каапэрацыя зараз працуе бяз пізоўкі, не апіраючыся на яе таму, што амаль уся пізоўка нашай сельска - гаспадарчай каапэрацыяй страчана. А на справе гэта азначае, што апарат працуе бяз мас. Наша каапэрацыя выглядае, як кажуць, генэралам бяз арміі. Галавакружэньне ад посьпехаў, якое ў нас мела месца, прывяло ў радзе выпадкаў да таго, што многія арганізацыі разьвілі непамерны арганізацыйны вуд. Не замацаваўшы новага, пачыналі ліквідаваць старое, г. зн., не замацаваўшы калгасу, пачалі ліквідаваць сельска - гаспадарчую каапэрацыю —вытворчыя аб'яднаньні, пачалі стваць нейкія інтэгралы, пачалі ліквідацыю спэцыяльных сыстэм сельска - гаспадарчай каапэрацыі і гэтым самым яны ставілі пад пагрозу ўздым і спэцыялізацыю ўсёй сельскай гаспадаркі ў масавым маштабе, на падставе ўцягненьня шырокіх мас сялянства, якое яшчэ пакуль што не ўвайшло ў калгас.

Гэта, таварышы, адно з самых сур'ёзных пытаньня

XIII зьезд КП(б)Б

Калгасны рух і ўздым сельскай гаспадаркі

Даклад тав. Галадзеда

Важнейшая праблема разьвіцьця сельскай гаспадаркі БССР

Заключэньне я хачу спыніцца на [illegible]ных праблемах разьвіцьця сельскай гаспадаркі БССР. Паколькі час [illegible] кладу набліжацца да канца, [illegible] буду падрабязна аналізаваць [illegible]лем, а напрабую толькі па[illegible]ноўныя з іх на абгаварэньні [illegible]ноўнай задачай зьяўляецца [illegible]лейшай калектывізацыі сельскай гаспадаркі БССР на падставе правядзеньня ленінскай палітыкі ў справе калектывізацыі, захаваньня прынцыпу сапраўднай добраахвотнасьці. У першую чаргу ў гэтым пытаньні трэба даць самы рашучы адпор тым разважаньням і размовам, што нібыта мы, г. зн. партыя, адмаўляецца ад лініі на далейшую калектывізацыю і што тут трэба палажыцца на «самацёк». Гэтыя разважаньні, як я ўжо гаварыў, зьяўляюцца простымі праўленьнямі правага апартунізму, па якіх трэба біць са ўсёй сілай нашай партыі; наадварот, мы павінны стаяць на чале калгаснага руху, кіраваць ім. Канкрэтная наша задача ў гэтым пытаньні заключаецца ў тым, каб замацоўваючы посьпехі на калектывізацыі сельскай гаспадаркі, рухацца далей па гэтым шляху, як асноўным шляху сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Унутраное замацаваньне арганізаваных калгасаў будзе адыгрываць адну з важнейшых роляй у справе далейшай калектывізацыі, бо тое сялянства, якое не ўвайшло яшчэ ў калгас, будзе даваць веру больш добрым прыкладам працы калгасаў, чымся нашай слоўнай агітацыі.

І таму трэба паставіць працу існуючых калгасаў так, каб яны адразу зьявіліся прыкладамі для вакольных бяднякоў - серадняцкіх гаспадарак, не ўвайшоўшых яшчэ ў калгасы. Калі селянін убачыць, што ў калгасе лепш працаваць, што сельская гаспадарка, аб'яднаная ў калгас, дае больш прыбытку, тады і сам селянін пераканаецца ў выгоднасьці калгаснай формы зямляробства і пойдзе ў калгас.

Гаворачы аб далейшай калектывізацыі, мы павінны вырашыць пытаньне і аб тэмпах калгаснага будаўніцтва. У тэзісах, якія прапануюцца на зацьвярджэньне зьезду, мы фармулюем гэту задачу так, што пры захаваньні ленінскіх прынцыпаў у справе калектывізацыі, пры сапраўдным кіраваньні калгасным рухам, пры правядзеньні правільнай лініі ў адносінах да серадняка, мы можам арыентавацца на тое, што на працягу пяцігодкі ў асноўным будуць калектывізаваны бяднякова - серадняцкія сялянскія гаспадаркі БССР. Што значыць — у асноўным? — Гэта значыць, што не ва ўсіх раёнах можа быць праведзена калектывізацыя ўсіх бяднякова-серадняцкіх гаспадарак на 100 проц. Дый наогул, ці можна ставіць такую задачу ў безапэляцыйным парадку, каб абавязкова калектывізаваць усе 100 проц. іменна на працягу такога-та часу? Па-мойму, гэта нават і ня мае значэньня. Нам трэба дабіцца калектывізацыі бяднякова - серадняцкіх гаспадарак у адведны тэрмін — у даным выпадку на працягу пяцігодкі — у асноўным, гэта значыць, у аграмадным большасьці. І калі-б у нас было калектывізавана, скажам, ня 100 проц., а 80, дык па сутнасьці гэта ёсьць ужо амаль поўнае вырашэньне задачы пераўтварэньня дробных і драбнейшых сялянскіх гаспадарак на сацыялістычны лад, бо на справе гэта азначае, што калектывы, калі яны аб'ядноўваюць 80 проц. бяднякова - серадняцкіх гаспадарак, па сутнасьці будуць надзейнымі камандными вышынямі ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі ў тым напрамку, які нам патрэбен, г. зн. у напрамку сацыялістычным. Нават і тады, калі мы маем 15-20 проц. калектывізаваных гаспадарак, і то яны ўжо зьяўляюцца вялікай апорай і адыгрываюць вялікую ролю ў навіраваньні працэсаў разьвіцьця сельскай гаспадаркі ў бок сацыялістычнага разьвіцьця, а калі-б у нас было 80 проц., дык астатнія 20 проц. некалектывізаваных гаспадарак ужо нямінуча далучацца да калгасаў на працягу адведнага часу, бо нашы індустрыяльныя мерапрыемствы, якія праводзяцца дзяржавай і якія зьяўляюцца асноўным вагаром пераўтварэньня сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад, ды плюс калгасы, якія аб'яднаялі-б аграмадную большасьць сялянскіх гаспадарак, — гэта і ёсьць усё гэсе, што нам неабходна для поўнай перамогі ў справе пабудовы сацыялістычнай вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы.

Значыць, асноўная наша задача заключаецца ў тым, каб іменна забясьпечыць такі процант калектывізацыі, які зьявіўся-б вядучым пачаткам для ўсіх астатніх сялянскіх гаспадарак.

Нам неабходна таксама ў справе далейшай калектывізацыі надаць асаблівую ўвагу арганізацыі прасьцейшых відаў калгасаў - таварыству супольнай апрацоўкі зямлі. У тэзісах мы гэтае пытаньне падрабязна фармулюем, як адну з важнейшых задач, паўтараць я гэтага ня буду. Але трэба мець на ўвазе, што нашы арганізацыі павінны ўсімі мерамі заахвочваць бяднякова - серадняцкае сялянства да арганізацыі прасьцейшых форм калгаснага аб'яднаньня. Гэта будзе аднэй з важнейшых умоў далейшага пераходу прасьцейшых відаў калгаснага аб'яднаньня на наступную вышэйшую ступень — на арцельную форму.

Другая важнейшая праблема, якая стаіць перад намі ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі, гэта праблема разьвіцьця жывёлагадоўлі, і наогул праблема спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі. Я ня буду прыводзіць лічбаў, якія характарызуюць стан з разьвіцьцем жывёлагадоўлі, адзначу толькі, што факты гавораць аб цяжкім стане з жывёлагадоўляй у БССР. У кантрольных лічбах на 1929-30 год мы ставілі задачу павялічыць стада ў пераводзе на буйную рагатую жывёлу на 10 проц., а замест выкананьня гэтай задачы ў нас адбылося зьніжэньне стада, чым яно было ў мінулым годзе. Гэтае скарачэньне вызначаецца прыкладна на 20,7 проц. З гэтага відаць, якая вялікая пагроза стварылася ў разьвіцьці жывёлагадоўлі.

Бюро ЦК КП(б)Б і СНК прынялі спэцыяльны плян разьвіцьця жывёлагадоўлі на гэты год. Ад поўнага правядзеньня гэтага пляну ў жыцьцё ў значнай частцы залежыць задача ліквідацыі прарыву ў разьвіцьці жывёлагадоўлі. Але, на вялікі жаль, гэты плян адпаведнымі арганізацыямі і месцам праводзіцца зусім дрэнна. Нашай работа - сялянскай інспэкцыі прыдзецца сур'ёзна націснуць на праверку выкананьня гэтага спэцыяльнага пляну разьвіцьця жывёлагадоўлі, прыцягваючы да суровай адказнасьці ўсіх тых, хто нядбайна адносіцца да гэтай важнейшай справы.

Я ня буду гаварыць аб тым, якое значэньне для Беларусі мае задача разьвіцьця жывёлагадоўлі. Напомню толькі аб тым, што БССР пры правільнай пастаноўцы гэтай справы, пры пасьпяховым ажыцьцяўленьні задачы разьвіцьця жывёлагадоўлі можа зьявіцца адным з асноўных раёнаў у Савецкім Саюзе па разьвіцьці жывёлагадоўлі, асабліва па разьвіцьці сьвінагадоўлі. У нашых пэрспэктыўных плянах карэннае вырашэньне праблемы жывёлагадоўлі, як і вырашэньне праблемы спэцыялізацыі ў сельскай гаспадарцы пасгул, мы вызначаем праз арганізацыі буйных савецкіх і калектыўных гаспадарак.

Вопыт вырашэньня збожжавай праблемы ў збожжавых раёнах Саюзу выразна ўпэўнівае ў тым, што і вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы павінна ісьці па шляху арганізацыі буйных савецкіх і калгасных гаспадарак. Мы на гэты шлях ужо сталі.

Трэцяй важнейшай праблемай у разьвіцьці сельскай гаспадаркі БССР павінна быць задача разьвіцьця тэхнічных культур (лён, каноплі). І ў гэтай галіне мы можам зьявіцца адным з асноўных раёнаў усяго Савецкага Саюзу — гэта значыць, раёнам разьвіцьця лубяных культур. Такая прыкладная ўстаноўка існуе ў саюзных арганізацыях у адносінах да БССР, і БССР уключаецца ў групу асноўных раёнаў разьвіцьця тэхнічных культур. Гэта дае нам вялізарныя пэрспэктывы для разьвіцьця тэкстыльнай прамысловасьці. Пры ажыцьцяўленьні мэліярацыі мы сапраўды можам паставіць справу разьвіцьця ільну і каналель у такім маштабе, які дасьць магчымасьць утварыць сур'ёзную сыравую базу для разьвіцьця тэкстыльнай прамысловасьці. Гэта трэба мець на ўвазе, таму я падкрэсліваю вялікае значэньне выкананьня пляну пасеўнай кампаніі па ільне і каноплях у гэтым годзе.

Чацьвертай праблемай уздыму сельскай гаспадаркі БССР зьяўляецца праблема мэліярацыі. Мы ў гэтым напрамку разгарнулі ўжо досыць шырокія работы. Гэта праблема застаецца і надалей, як адна з асноўных. У гэтым годзе ў мэліярацыю ўкладаецца, прыкладна, 7 мільёнаў рублёў, на наступны-ж год мы запраектавалі ўкласьці 30 мільёнаў руб. Таму нам неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на тое, як скарыстоўваюцца гэтыя сродкі, бо гэта ёсьць вельмі важная задача. Трэба мець на ўвазе, што наша мэліярацыя мае ўсесаюзнае значэньне і калі ўзяць прыклады правядзеньня гэткай асуальнай мэліярацыі, дык мы ўбачым, што ня толькі ў іншых раёнах Саюзу, але нават і ў іншых дзяржавах вы ня знойдзеце такіх работ на асуальнай мэліярацыі па сваім маштабе. Трэба навакол гэтай праблемы сканцэнтраваць увагу шырокіх працоўных мас усёй савецкай грамадзкасьці.

Пятай задачай у разьвіцьці сельскай гаспадаркі зьяўляецца задача індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі БССР і забесьпячэньня яе машынамі і трактарамі. Мы ў гэтым годзе тропкі павялічылі завоз трактароў супроць таго пляну, які намі раней быў зацьверджаны, асноўную масу трактараў, якую мы атрымліваем звыш наперад зацьверджанага саюзнымі органамі пляну, мы павінны накіраваць у прымежныя акругі. Я ня буду гаварыць тут аб тым, чаму мы навінны так врабіць. Дэлегаты зьезду самі гэта разумеюць. У нас трактараў у сельскай гаспадарцы мала. Наша задача скарыстоўваць гэтыя трактары больш рацыянальна, больш прадукцыйна. Гэта мае вялікае значэньне.

(Голас прэзыдыуму: колькі ў нас ёсьць трактараў?).

У нас ёсьць каля 300 трактараў па нарадзе-ж каля 500, але яны яшчэ ня ўсе прывезены, да восені будзе больш як 500. Яны будуць завозіцца паступовa, а да вясны гэтага году мы мелі ўсяго 189 трактараў. Гэта значыць, менш як у любой акрузе Украінскай рэспублікі.

У справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі БССР важнейшую ролю павінна адыгрываць разгортваньне прамысловасьці на сельска - гаспадарчым машынабудаўніцтве. Тыя заводы, якія працуюць у нас на вырабе сельска - гаспадарчых машын і інвэнтару, нам трэба хутчэй пераарыентаваць на абслугоўваньне ў першую чаргу аграмаджанага вымяроўства, бо той асартымэнт сельска - гаспадарчага інвэнтару і машын, які выпрацоўваўся да гэтага часу, да сёнешніх умоў сельскай гаспадаркі ўжо не падыходзіць. Нам патрэбна пераарыентаваць нашу машынабудаўнічую прамысловасьць на абслугоўваньне сельскай гаспадаркі больш складанымі машынамі, гэта значыць, на абслугоўваньне буйных калектыўных гаспадарак у першую чаргу.

Такім чынам, задача рэканструкцыі заводаў, якія робяць сельска - гаспадарчыя машыны, зьяўляецца аднэй з важнейшых, што стаяць перад усімі нашымі арганізацыямі.

Задача індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі — набудова прадпрыемстваў па першапачатковай пераапрацоўцы сельска - гаспадарчых прадуктаў, электрыфікацыі і інш. у БССР набывае адно з рашаючых значэньняў і для справы калектывізацыі. Чаму? А таму, што ў нас, у БССР, ва ўмовах інтэнсыўнага зямляробства калектывізацыя адрозьніваецца ад калектывізацыі збожжавых раёнаў. Там працэс калектывізацыі заканчваецца разам са зборам збожжа і ссыпкай яго ў элеватары або на прыстань, у нас працэс калектывізацыі гэтым яшчэ не закончаны. У нас, як у раёне інтэнсыўнага зямляробства, працэс калектывізацыі працягваецца ня ступень першапачатковай пераапрацоўкі тых прадуктаў, якія здабываюцца ад паляводзтва, ад тых ці іншых культур і жывёлагадоўлі. Толькі пасьля першапачатковай іх пераапрацоўкі гэтыя прадукты могуць паступаць для спажываньня ў гарады і г. д. Такім чынам, для нас тып агра - індустрыяльных калгаскамбінатаў, як праблем, зьяўляецца характэрным тыпам калектывізацыі, як калектывізацыі інтэнсыўнага зямляробства. У сувязі з гэтым задачы індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі, арганізацыя прадпрыемстваў, па першапачатковай пераапрацоўцы сельска - гаспадарчых прадуктаў — гэта зьяўляецца аднэй з галоўнейшых задач усяго працэсу калектывізацыі. Толькі пасьля гэтага прадукты сельскай гаспадаркі, раёны інтэнсыўнага зямляробства пераходзяць у прамысловасьць, пераходзяць у гарады для забесьпячэньня пралетарыту.

Вось, прыкладна, асноўная ўстаноўка далейшых праблем уздыму і разьвіцьця сельскай гаспадаркі БССР. На гэтым я і закончу.

І так таварышы, мы падагульваем на зьезьдзе вялікі этап нашай працы на сацыялістычнай перабудове нашай гаспадаркі. Ёсьць шмат памылак, але ёсьць шмат і вялікіх дасягненьняў, шмат станоўчага ў праробленай намі працы. На гэтых памылках мы павінны вучыцца, каб іх не паўтараць, а на падставе правільнай генэральнай лініі партыі, вядучы бязьлітасную і энэргічную барацьбу на два фронты — і з правымі апартуністымі, і з «левымі» загібшчыкамі і прымірэнцамі да іх — мы павінны з посьпехам пайсьці па шляху сацыялістычнай перароблі нашай краіны, у тым ліку і пераробкі сельскай гаспадаркі на базе калектывізацыі. (Воплескі).

Выкананьне пяцігадовага пляну прамысловасьці

Даклад тав. Грысевіча

У справе ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі па індустрыялізацыі БССР,—асноўная задача інтэнсыўнага разьвіцьця прамысловасьці, якая павінна адыгрываць кіруючую і ператвараючую ролю ўсёй народнай гаспадаркі. Гэта задача зьяўляецца асноўнай, кіруючай на працягу ад XII зьезду КП(б)Б па гэты час.

XII зьезд КП(б)Б у галіне індустрыялізацыі БССР даў наступную дырэктыву: «далейшая індустрыялізацыя БССР, павялічэньне ўдзельнай вагі прамысловае прадукцыі, наогул прадукцыі ўсёй народнай гаспадаркі краю, узмацненьне і пашырэньне пралетарскай базы—павінны ісьці па шляху ўзмацненьня і пашырэньня прамысловай вытворчасьці, якая грунтуецца, галоўным чынам, на мясцовым с.-г., лясным і мінэральным сырцы, а таксама праз насаджэньне ў БССР прамысловых прадпрыемстваў, якія грунтуюцца на транспартабэльным прывазным сырцы поўфабрыкату».

Як-жа ў асноўным выконвалася гэта дырэктыва партыйнымі арганізацыямі і гаспадарчымі органамі пад кіраўніцтвам нашага ЦК? Як мы за гэтыя два гады ажыцьцяўляем пяцігодку?

Капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць пяцігадовым плянам вызначаліся ў 280 м. р. за 1928-29 г., у 29-30 г. мы ўжо ўкладаем 73 м. р. замест 63 м. р., прадугледжаных пяцігодкай, ці на 16 проц. больш у адносінах да гэтых 2-х год.

Цікава адзначыць, як разгортвалася капітальнае будаўніцтва за апошнія гады. У 26-27 г. на капітальныя работы было выдаткавана 10,8 м. р., у 27-28 г.—16,4, у 28-29 г.—24,7, а ў 29-30 г.—48 м. р.

Да 27-28 г. было распачата і набудавана 14 прадпрыемстваў, у 28-29 г.—17, у 29-30 г. пачынаецца набудова кала 40 прадпрыемстваў. Такім чынам, капітальнае будаўніцтва падводзіць сур'ёзную базу для далейшага разьвіцьця прамысловасьці.

Калі мы возьмем груба арыентовачны варыянт, які мяркуецца на 30-31 г., дык капітальныя ўкладаньні мяркуюцца ў значна большым разьмеры.

Наша прамысловасьць ужо далёка апярэдзіла даваенныя разьмеры вытворчасьці. У параўнаньні з даваенным часам, валавая прадукцыя ўсёй цэнзавай прамысловасьці ў 28-29 г. узрастае ў 2½ разы, прычым за пэрыяд з 24-25 г. па 28-29 г мы маем рост прадукцыі з 72 м. р. да 252 м. р., а гэты год мы будзем мець 400 м. р. Асабліва буйны рост наглядаецца па прыбярэжным прамысловасьці ВСНГ, г. зн. больш буйной прамысловасьці. Калі ў 22-23 г. прадукцыя па цэнах 26-27 г. складала каля 26 м. р., дык у 29-30 г. мы маем ужо звыш 300 м. р. Гэтыя дасягненьні стануць яшчэ больш выразнымі, калі мы прасочым дынаміку выпрацоўкі галоўнейшых вырабаў, якія выпускае беларуская прамысловасьць.

Галоўныя вырабы	Выраблена у даваен час	24-25 г.	28-29 г.	29-30 г.
Цэгла ўм. л. шт.	60	13,7	79	—
Фанэра (у тыс. кв. мэтр.)	45	26,7	70,1	129
Паперы (у тыс. тон)	21,3	18	30,3	45
Запалкі (у тыс. скрын.)	630	486	1425	2950

Разьвіцьцё прамысловасьці за гэты час ішло ня толькі за кошт аднаўленьня галін, якія існавалі ў даваенны час, але і за кошт арганізацыі цэлага ряду новых вытворчасьцяй. Наадварот, калі ў даваенныя часы на тэрыторыі Беларусі вінакурэньне давала 9½ млн. вёдзер, дык зараз яно дае прыблізна 3 млн. вёдзер, бо мы выцісьнем яго іншымі відамі прамысловасьці.

Буйное разьвіцьцё прамысловасьці ішло побач з ростам рабочай сілы. На ўсёй цэнзавай прамысловасьці лік рабочых павялічыўся з 28.974 у 24-25 г. да 46.563 у гэтым годзе і ў 2 разы больш, чым у даваенны час. Рэзка зьмяняецца матар'яльна-тэхнічная база, прамысловасьці ў бок павышэньня яе тэхнічнага ўзроўню і канцэнтрацыі. Пацьвярджэньнем гэтага можа служыць наступнае: калі ўзяць шкляную прамысловасьць, якая была ў нас больш-менш буйной прамысловасьцю ў даваенны час, дык на адно прадпрыемства гэтай прамысловасьці прыпадала 189 чал., а ў 28-29 г. мы маем 505 рабочых. Мэталяапрацоўчая прамысловасьць—раней адно прадпрыемства мела 55 чал., зараз—247 чал., гарбарня—20, цяпер 132, абутковая—70, цяпер 122, ільняная—576, цяпер 1.144, папяровая—153-362.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) правільна праводзіць лінію на тое, каб акраінныя рэспублікі падцягнуць, індустрыялізаваць іх на базе сацыялістычнае рэканструкцыі, узмацніць у іх пралетарскую базу.

Прадукцыйнасьць працы за гэты час нас вялікі рост. Тыя лічбы, якія прыводзіў т. Вэнэк аб электрыфікацыі БССР, гавораць, што электра-ўзброенасьць нашае народнае гаспадаркі надзвычай узрастае і, зразумела, што адсюль павялічваецца і прадукцыйнасьць працы. Узрост, які ідзе за кошт уводу ў эксплёатацыю новых прадпрыемстваў, пабудованых на новай тэхнічнай базе, увядзеньне новага абсталяваньня і рад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

Прамысловасьць БССР стала на шлях арганізацыі новых вытворчасьцяй і паступовай рашучай ліквідацыі залежнасьці ад імпарту. Я вам прывяду некаторыя кантынгенты, якія мы раней завозілі з-за мяжы, а зараз выпрацоўваем і ў далейшым будзем пашыраць выпрацоўку на нашых мэталязаводах. Напрыклад, на заводзе «Чырвоны мэталіст» ў Віцебску было намечана на будучы год выпусьціць на 6.800 т. р. прадукцыі, з іх 3.500 т. р. прадукцыі, якую мы завозілі з-за мяжы. Што гэта за прадукцыя? Гэта такое абсталяваньне, як плугі балотныя, трактарныя плугі, бораны зорчатыя, жмыхадрабілкі, кораньрэзкі.

Трэба адзначыць, што ў сувязі з гэтым праграма «Чырвоным Мэталістым» мянялася надзвычай часта. Гэтыя частыя зьмены ўносілі вялікую нэрвовасьць у работу Мэтпрому, што адбівалася і на рабочых, і на нашых партыйных камітэтах і не магло не адбіцца і на гаспадарчым кіраўніцтве. Таксама і на другіх заводах у сувязі з бурным ростам тэмпаў калектывізацыі прышлося мяняць вельмі часта вытворчыя праграмы.

На Гомсельмашы, які яшчэ не адбудаваны цалкам, намечана выпускаць абсталяваньне, якое мы дагэтуль імпартавалі (на 24 м. р.), а ўсяго яго праграма намечана на 30 м. р. На «Чырвоным Адраджэнцы» ў Магілеве ўся праграма вызначана ў 900 тыс. руб., ён будзе выпускаць імпартнага абсталяваньня на 640 тыс.

Разам па с.-г. машынабудоўлі ўся праграма на будучы год складае суму ў 31.700 тыс., з іх на тое абсталяваньне, якое мы прывозілі раней з-за мяжы, прыпадае 29.140 тыс. руб. У гэтым годзе мы па ўсіх заводах с.-г. машынабудоўлі мелі праграму ў 8.264 тыс., з іх 2.550 тыс. прыпадала на імпартнае абсталяваньне. Калі ўзяць усё наша машынабудаўніцтва, дык у гэтым годзе праграма складала 14.146 тыс. руб., прычым з іх на імпартнае абсталяваньне—4.700 тыс., а на будучы год уся праграма складае 30.700 тыс., з іх імпартнага абсталяваньня на 18.770 тыс.

Я павінен сказаць некалькі слоў аб тых заводах, якія мы ў гэтым годзе прынялі ў ВСНГ ад Наркамшляху. Гэта гомельскія майстэрні, завод Ланцуцкага. У 29-30 годзе гэты завод выпускае прадукцыі на 3.261 т. руб., на будучы год мы арыентовачна ўстанавілі праграму для яго ў 10 млн., з гэтых 6.500 тыс. руб. выраб імпартнага абсталяваньня. На менскіх майстэрнях мы думаем паставіць выключна выраб абсталяваньня для фабрык - кухань, бо гэта абсталяваньне зараз цалкам завозіцца з-за мяжы. Праграма вызначаецца на 2 м. р., але магчыма, што прыдзецца не павялічыць.

Гэтыя лічбы лепш за ўсё гавораць аб тым, як на прыкладзе, хаця-б і Савецкай Беларусі, [illegible] зараз вызваляемся ад залежнасьці ад замежнага капіталу. Гэтыя лічбы наглядней за ўсё сьведчаць аб правільнай лініі Цэнтральнага Камітэту нашае партыі, каб як мага хутчэй вызваліцца ад залежнасьці ад капіталістычных дзяржаў.

Гэту лінію мы праводзім з усёй жорсткасьцю, з усёй рашучасьцю, з тым, каб у бліжэйшыя гады нам ужо ня прыходзілася ўвозіць замежнае абсталяваньне, а лінія ўзята зусім правільная, каб як мага больш выраблять машын, абсталяваньня і разьмяшчаць яго на нашых саюзных прадпрыемствах.

Усе гэтыя дасягненьні ў рэспубліканскай прамысловасьці мы маем бязумоўна, дзякуючы вялізарнейшаму ўздыму ініцыятывы і актыўнасьці рабочых мас, што выяўляецца ў шырокім разьвіцьці сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Гэтых палітычных фактараў ніяк нельга абыйсьці, калі мы гаворым аб прамысловасьці. Наяўныя дасягненьні пацьвярджаюцца лічбамі ходу выкананьня пяцігодкі. 1929-30 г. у параўнаньні з мінулым дае нам узрост валавой прадукцыі на 72 проц. Колькасьць рабочых за 7 мес. павялічылася на 28 проц. (у параўнаньні з 7 мес. мінулага году). Усяго з 1-Х на 1-V 30 г. ацягнута да 9.000 чал. На бесьпрацоўнику пераведзены 63 прадпрыемствы, на 7-мігадзінны рабочы дзень — 21 прадпрыемства.

Разьвіцьцё прамысловасьці ў акруговым разрэзе малюе нам прадстаўленая табліка. Па ёй відаць наступнае: Па Менскай акрузе ў 28-29 г. мы ўлажылі ў прамысловае будаўніцтва 6.503 т. р., а ў гэтым годзе — 10.165 т. р. Калі ўзяць Віцебск, дык у 28-29 г. капітальныя ўкладаньні складалі 5.532 т. р. У гэтым годзе — 10.567 т. р., Гомельская акруга — 5.172 т. р., у гэтым годзе — 11.861 т. р., Магілеўская — 2.075 т. р., сёлета — 8.769 т. р., Ворша — 1.273 тыс. руб., сёлета — 4.291 т. р., Полацак —194 т. р., сёлета — 1.625 т. р., Мазыр летась 511 т. — 367 тыс., Бабруйск — 3.482 т. р. — 3.753 т. р.

Асноўныя паказальнікі разьвіцьця прамысловасьці ВСНГ БССР па акругам

Назва акруг	Валавая прадукцыя ў млн. руб. па цэнах 26-27 г. 1927-28 г.	1928-29 г.	1929-30 г.
Менская	26,2	43,2	79,6
Віцебская	32,7	54,1	82,9
Гомельская	26,6	39,8	74,9
Бабруйская	10,4	12,1	27,9
Магілеўская	6	9,3	24,6
Аршанская	5,6	5,5	9,5
Мазырская	5,2	6,7	9,1
Полацкая	1,2	1,3	2,4

Калі мы возьмем 30-31 г., дык гэтыя намячэньні зьяўляюцца груба арыентовачнымі, бо яны яшчэ не зацьверджаны ўрадовымі органамі Саюзу. Я гэта падкрэсліваю, каб потым ня было гутарак, што вось, моў, вызначылі, а потым не далі, дык з мяркуемых 150 м. р. асобныя акругі павінны атрымаць: Менская — 21 млн., Гомельская — 35 млн. (яна набывае так званую цяжкую індустрыю, мэталяапрацоўчую і машынабудаўнічую), Мазырская акр. — 4 м. Толькі гэтымі днямі горны аддзел ВСНГБ скончыў досьледы ў Мазырскай акрузе. Знойдзена крышталічная скала, якая ідзе з Украіны, ад яе мы зможам забясьпечыць каменем ня толькі прамысловасьць ВСНГ, але наогул і ўсю рэспубліканскую прамысловасьць, і пляхавае будаўніцтва, якое патрабуе ад нас вялікае колькасьці каменьняў. У Бабруйскую акругу мяркуецца ўкласьці 12.786 т. р., Магілеў — 29 м. р., Воршу—18 м. р., Полацак — 10 м. р. Такім чынам, гэтыя лічбы сьведчаць аб тым узросьце нашае прамысловасьці індустрыялізацыі БССР, які мы маем за апошнія гады дзякуючы дапамозе ўраду Савецкага Саюзу.

Паказваючы на нашы вялікія посьпехі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, мы павінны падкрэсьліць што ўсё-ж першае паўгодзьдзе 29-30 г. дае нам незадавальняючыя вынікі па радзе паказальнікаў. Па валавой прадукцыі мы праграму выканалі толькі на 92,5 проц., г. зн. 43 проц. гадавога заданьня.

Мы не дабралі ў сувязі з недавыкананьнем праграмы па валавой прадукцыі 8 м. руб. за 7 мес. Калі ўзяць абутковую прамысловасьць, дык яна не дадала 152 тыс. пар абутку. Запалкавая прамысловасьць не давыпрацавала за 7 мес. 28 тыс. скрынак запалак, баваўняная не давыпрацавала больш 800 тыс. мэтраў тканіны. Адначасова з гэтым, мы маем недавыкананьне і па зьніжэньні сабекошту.

Цэнтральны Камітэт даў дырэктыву зьнізіць сабекошт па рэспубліканскай прамысловасьці на 11 проц., а мы маем за першае паўгодзьдзе зьніжэньне на 7 проц., за 7 месяцаў — 7,8 проц., гэта без Лесбелу, а калі ўзяць Лесбел, дык мы маем прыблізна 6,5 проц. Дрэнна і з якасьцю прадукцыі. XII зьезд КП(б)Б завастрыў увагу на тым, што якасьць прадукцыі пагоршваецца. Мы і на XIII зьезьдзе адзначаем, што ў гэтым напрамку дырэктыва ня выканана.

Гэта, таварышы, гаворыць аб нездавальняючай рабоце нашай прамысловасьці і партыя павінна з усёй сілай націснуць на гэту справу з тым, каб зараз дабіцца пералому, каб на працягу застаўшыхся месяцаў запоўніць гэты прарыў і ня толькі выканаць цалкам памячэньні прамфінпляну, але-ж і перавыканаць іх. Толькі тады мы зможам выканаць намечаную праграму капітальнага будаўніцтва гэтага году на 48 м. р. па прамысловасьці ВСНГ.

Скажу пра ход капітальнага будаўніцтва па рэспубліканскай прамысловасьці. У той час, калі за першае паўгодзьдзе 1928-29 г. гадавы плян капітальнага будаўніцтва быў выканан на 26 проц., дык у гэтым годзе за першае паўгодзьдзе мы маем 30,6 проц. Колькасьць занятай рабсілы ў мінулым годзе ў студзені месяцы 1.118 чал., у гэтым годзе ў студзені месяцы — 3.090 чал., у лютым месяцы мінулага году — 950 чал., у гэтым 2.882, у сакавіку 1.243 — 3.393 чал., у красавіку 1.882—5.680 чал., у маі — 1.998 — 8.153 чал.

Як бачыце, у сэнсе колькаснага ахопу работ і ў сэнсе выкананьня мы маем паказальнікі лепшыя, чым у мінулым годзе. Але-ж у справе якасьці будаўніцтва, зьніжэньня сабекошту будаўнічага індэксу, пахваліцца мы ня можам. Гэта з прычыны таго, што ў штодзённай рабоце мы мала зварачаем увагу на наша будаўніцтва.

Разгортваньне прамысловасьці адначасова адбывалася пры няўхільным паляпшэньні матар'яльнага становішча рабочае клясы і ўздыме культурнага ўзроўню. Сярэднягадавы прырост заробстнае платы за пэрыяд 1929-30 г. складае 11 проц. На мерапрыемствы па ахове працы і рабочым жыльбудаўніцтве і культ. - бытавым абсталяваньні за апошнія 2 гады асыгнавана 9 м. р. Скарачаецца працяг рабочага дня, памяншаецца беспрацоўе з 37.000 на 1-га мая 1929 г. да 19.800 чал. на 1 мая 1950 г., уключаючы 6.540 чал., якія навучаюцца на курсах па перакваліфікацыі.

Улічваючы, што наша прамысловасьць павінна разгортвацца ў асноўным на мясцовым сырцы, перад намі стаіць задача стварыць сырцовую базу для прамысловасьці. Таму перад усёй КП(б)Б стаіць задача, як мага больш пашырыць тэхнічныя культуры, пасевы ільну і каналель. пастанова бюро ЦК ёсьць ад тым, каб стварыць у веданьні ВСНГ ільняны трэст. Мы зараз гэты трэст арганізавалі. На гэту мэту асыгнавана ў 1929-30 г. 1.700 т. р.

Гаворачы аб сырцовай базе, я хачу трохі сказаць аб нашых дасьледчых работах. Навуковыя досьледы павінны зараз узмацніцца. Мы зараз праводзім досьледы, але яшчэ зусім мала, а без навукова-дасьледчай работы мы ня зможам у патрэбнай меры вырашыць пытаньне аб нашай сырцовай базе. Я павінен спыніцца на тым, што ў сувязі з праведзенымі досьледамі, мы маем магчымасьць будаваць цэмэнтны завод, які будзе выпускаць к канцу пяцігодкі 1.400 тыс. бочак цэмэнту, а ў канцы 1930-31 г. павінен будзе даць 200.000 бочак.

Нам трэба скарыстаць сырцовую базу для пашырэньня цагелень, торфазаводаў. Максымальнае скарыстаньне лясных багацьцяў шляхам усебаковай хімічнай і мэханічнай пераапрацоўкі драўніны, пашырэньня вытворчасьці будаўнічых матар'ялаў, максымальна скарыстоўваючы для гэтай мэты мясцовую і саматужную прамысловасьць.

Далейшае разьвіцьцё прамысловасьці ня можа з посьпехам вырашыцца без стварэньня электрычнай базы. Толькі на базе электрыфікацыі магчыма карэнная рэканструкцыя прамысловасьці і ўсяе народнае гаспадаркі.

Слабым месцам у нашай рабоце таксама зьяўляецца кваліфікаваная рабочая сіла.

Перад усімі арганізацыямі, пачынаючы з ВСНГ і канчаючы заводакіраўніцтвамі, перад партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі стаіць задача падрыхтоўкі новай рабочай сілы і праз школы ФЗУ, праз ЦПШ, праз усе існуючыя формы падрыхтоўкі рабочае сілы. Мы павінны будзем яе падрыхтаваць для таго, каб забясьпечыць рэспубліканскую прамысловасьць, асабліва мэталёвую, бо ў мэталяпрамысловасьці мы надзвычай востра адчуваем недахват кваліфікаванай рабочай сілы. Такое-ж становішча ў нас і з інжынэрна-тэхнічным пэрсаналам. Тэхнічнага пэрсаналу ў нас мала, асабліва ў будаўніцтве.

Адначасова з узмоцненай работай па падрыхтоўцы спэцыялістых праз вышэйшыя навучальныя ўстановы, мы павінны мабілізаваць спэцыялістых з апаратаў і накіроўваць іх на вытворчасьць. А ў нас яшчэ ёсьць такое становішча, калі рад гаспадарнікаў і кіраўнікоў скарыстоўваюць спэцыялістых на канцылярскай рабоце і адмаўляюцца ад пераводу іх на вытворчасьць. Гэта датычыць і НКПрацы т. Гнілякевіча, які першы павінен быў выканаць гэту дырэктыву, бо яму было даручана ЦК і СНК правесьці гэту мабілізацыю, а сваіх інжынэраў з апарату ён не адпусьціў.

Улічваючы нашы недахваты ў кадрах, ЦК пастанавіў адкрыць у гэтым годзе ВТНУ. Здаецца, т. Бэнэк аб гэтым гаварыў. Я падрабязна спыняцца на гэтым ня буду, але-ж і адчыненьне ВТНУ зараз ня можа нас забясьпечыць, бо спэцыялістых мы атрымаем толькі праз тры гады. Таму кантрактацыя застаецца і ў далейшым перад намі важнай задачай у сэнсе атрыманьня спэцыялістых з іншых саюзных рэспублік. Таксама нам трэба задаволіць практычныя мерапрыемствы па арганізацыі кароткатэрміновых курсаў інжынэраў і тэхнікаў вузкай спэцыяльнасьці.

Трэба адзначыць, што рэарганізацыя апарату прамысловасьці, згодна пастаноў ЦК нашай партыі, не знайшла яшчэ выстарчальнага дастасаваньня ў сэнсе вынікаў яе правядзеньня. Фармальна апарат перабудаваны а ў сапраўднасьці многія працуюць па-старому. І таму сёньня, на XIII зьезьдзе, мы павінны з усёй яскравасьцю сказа

За бальшавіцкія тэмпы, за пяцігодку ў чатыры гады!

На масоўцы рабочых Фрунзаўскага раёну

Вечарам 22-га чэрвеня адбылася рабочая масоўка, прысьвечаная надыходзячаму XVI-му зьезду УсесКП(б).

Сад «Прафінтэрн» быў перапоўнены рабочымі з заводаў і фабрык Фрунзаўскага раёну г. Менску.

З дакладам аб **выніках XIII-га зьезду КП(б)Б** выступіў старшыня СНК БССР тав. **Галадзед.**

— XIII зьезд КП(б)Б, адзначыў тав. Галадзед, бальшавіцку падышоў да ацэнкі пройдзенага этапу і вырашэньня тых вялікіх задач, якія стаяць перад партыяй, ставячы на першы плян пытаньні змаганьня за чыстату генэральнай лініі партыі. Тав. Галадзед падрабязна спыніўся на паасобных пытаньнях парадку дня зьезду і падкрэсьліў галоўныя дырэктывы зьезду, накіраваныя на вырашэньне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Тав. **Славінскі** ў сваей прамове ахарактарызаваў тыя задачы, якія стаяць перад партыяй у галіне рэканструкцыі прамысловасьці і перабудовы вёскі на сацыялістычны лад. Тав. Славінскі заваструў увагу рабочых на неабходнасьць бязьлітаснай барацьбы з правай небясьпекай, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з «левымі» загібамі і прымірэнцтвам, якія льлюць ваду на млын правых апартуністых.

На сцэне **рабочы заводу «Камунар».** Ён рапартуе XVI партзьезду аб дасягненьнях «камунараўцаў».

«Пры старым абшарпаным абеталяваньні, пры радзе цяжкасьцяй, зьвязаных з рэканструкцыяй заводу, вынікі работы першых 8 месяцаў даюць неравыкананьне прамфінпляну: па выпрацоўцы—на 103,6 проц. супроць пляну на першае паўгодзьдзе, на прадукцыйнасьці працы—на 35,7 проц. замест плянавых—29,9 проц., на зьніжэньні сабекошту—на 27,3 проц. замест—26 проц. паводле пляну; прагулы—супроць 0,66 проц. у 1928-29 годзе, зьніжаны ў першым квартале 1929-30 г. да—0,32%: лік рабочых з 413 у 1927-28 г. вырас да 9000 у 1930 г.»

Гэтых паказальнікаў можна было дасягнуць толькі дзякуючы высокай сьвядомасьці і адданасьці рабочых, што вылілася ў арганізацыю трох ударных пэхаў. **Рабочыя «Камунара» абгаварыўшы задачы надыходзячага партыйнага зьезду, абвясьцілі такарны цэх ударным імя XVI зьезду, арганізавалі яшчэ дзьве ўдарныя брыгады і адну камуну. 160 рабочых індывідуальна абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя XVI-га партзьезду.**

— Дасягненьні, якія мае наш край—лепшы довад правільнасьці генэральнай лініі партыі—залуляюць рабочыя фабрыкі «Камунарка», заводу «Дрэвааапрацоўшчык» і друкарні імя Сталіна. У знак гатоўнасьці змагацца за генэральную лінію партыі, супроць малавераў, скептыкаў і ўсякай масьці ўхілістых,—31 старых рабочых паказаных заводаў падалі на масоўцы заяву аб уступленьні ў рады партыі.

«Мы, ударнікі Ленінскага прызыву, ня можам стаяць у баку ад тае гіганцкае работы, якую праводзіць наша камуністычная партыя»—заявілі 5 рабочых друкарні імя Сталіна і ўручылі калектыўную заяву аб уступленьні ў партыю сакратару РК КП(б)Б т. Шпэктараву.

У сваёй рэзалюцыі па дакладу т. Галадзеда сход цалкам ухваліў пастановы XIII зьезду КП(б)Б «Лёзунг—«Пяцігодка ў чатыры гады», задача дагнаць і перагнаць у тэхнічна-эканамічных адносінах высока-разьвітыя капіталістычныя дзяржавы будуць выкананы пад выпрабаваным кіраўніцтвам ленінскай партыі»—гаворыцца ў рэзалюцыі.

— Тыя цяжкасьці, якія стаяць на нашым шляху ня могуць пахіснуць упэўненасьці ў перамозе сацыялізму. Цяжкасьці ў гапіне рабочага забесьпячэньня будуць пераможаны напружанасьцю нашых сіл.

— Рабочыя ўпэўнены, што надыходзячы XVI партзьезд па-ленінску вызначыць дапейшыя шляхі сацыялістычнага будаўніцтва—такі зьмест рэзалюцыі, прынятай па дакладу т. Галадзеда. Масавы мітынг паслаў прывітаньне XVI партзьезду і пажаданьне пасьпяховай работы.

Апрача гэтага рабочыя Фрунзаўскага раёну адзінадушна вынесьлі пастанову **прасіць урад СССР аб узнагародзе т. Сталіна ордэнам Леніна, за яго заслугі на сацыялістычным будаўніцтве і перад рэвалюцыйным пралетарыятам усяго сьвету.**

І. Ляўковіч.

Зямляўпарадкаваньне калгасаў і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Для стварэньня спрыяючых умоў да далейшай калектывізацыі і правільнага гаспадарчага росту калгасаў, павялічэньня пасеўнай плошчы і падняцьця ўраджайнасьці ў калгасах і ў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Праводзіць зямляўпарадкаваньне, захоўваючы абавязкова наступную чарговасьць: у першую чаргу зямляўпарадкуюцца саўгасы, калгасы, агра-індустрыяльныя калгаскамбінаты, трэрыторыі дзейнасьці машына-трактарных станцый.

Адначасова з зямляўпарадкаваньнем калгасаў, зямельныя органы павінны зямляўпарадкаваць, парушаемае ў зьвязку з зямляўпарадкаваньнем калгасаў, зямляўпарадкаваньне і тых індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія пасьля арганізацыі калгасаў не ўвайшлі ў іх.

У другую чаргу зямляўпарадкуюцца тыя населішчы і вёскі з вялікім дальназямельлем і заблытанасьцю зямлякарыстаньня, якія не ўвайшлі ў калгас, пры гэтым зусім забараняецца правядзеньне хутарскіх і адрубных форм зямляўпарадкаваньня.

2. Для стварэньня найбольш спрыяючых умоў арганізацыі калектыўных гаспадарак і нападжаньня сельска-гаспадарчай вытворчасьці ў іх, пічыць патрэбным, як правіла, на даным этапе калгаснага руху арганізоўваць калгасы ў межах аднэй вёскі або ў складзе груп насёлкаў ці хутароў.

3. Калі ў склад калектыўнай гаспадаркі, якая арганізуецца ў межах вёскі, уваходзяць ня ўсе бядняцка-серадняцкія двары, то зямляўпарадкавань не калгасаў робіцца праз выдзел калгасу зямлі ў адным вучастку.

У паасобных выпадках зямляўпарадкаваньне калгасаў і астатніх не ўвайшоўшых у яго бядняцка-серадняцкіх двароў, можа рабіцца і праз адвод зямлі ў некалькіх вучастках, прычым кожны раз з дазволу РВК, які вырашае гэта пытаньне пры ўдзеле прадстаўнікоў калгасу і спэцыялістых земорганаў у залежнасьці ад мясцовых умоў, моцнасьці калгаснай групы і інш., выходзячы пры гэтым з устанаўленьня правільных узаемаадносін паміж калгасамі і індывідуальнымі бядняцка-серадняцкімі дварамі.

4. Калектыўным гаспадаркам павінны адводзіцца лепшыя па якасьці і распалажэньні землі, пры гэтым павінны быць захаваны інтарэсы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія не ўвайшлі ў калгасы, з тым, каб ім была адведзена пахаць у межах тэрыторыі сваёй вёскі, а таксама, каб яны былі забясьпечаны сенажацямі, выгонамі (калі гэткія меліся раней у іх карыстаньні), прагонамі і вадапоямі.

5. Пры зямляўпарадкаваньні калгасаў бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, якія не ўваходзяць у калектыўныя гаспадаркі, адвод зямлі робіцца па фактычным зямлякарыстаньні, якое вызначаецца зямельнымі плянамі, зямельнымі запісамі, акладнымі лістамі па сельскагаспадарчым падатку.

6. Для калгасаў і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія знаходзяцца ў раёнах буйных балотных масываў і якія зямляўпарадкуюцца адначасова з выдзяленьнем значных плошчаў пад нанава арганізуемыя савецкія гаспадаркі,—норма зямлі вызначаецца зямляўпарадкуючымі праектамі ў залежнасьці ад якасьці ўжыткаў, напрамкаў гаспадаркі і інш. Гэтыя праекты (а разам з імі і нормы адводу) зацьвярджаюцца Народным Камісарыятам Земляробства.

7. Землі, якія знаходзіліся ў карыстаньні тых кулацкіх гаспадарак, якія пазбаўлены гэтага зямлякарыстаньня, і зямля тых кулацкіх гаспадарак, якая засталася пасьля адводу гэтым гаспадаркам згодна пастановы СНК БССР за 12 студзеня 1930 г. ня звыш 5 гэкт. зямлі, а таксама вымарачныя землі і землі запаснага фонду перадаюцца выключна калектыўным і савецкім гаспадаркам.

8. Пры зямляўпарадкаваньні калгасаў сядзібы і сядзібныя гароды як калгасьнікаў, так і індывідуальна-серадняцкіх гаспадарак пакідаюцца ў карыстаньні кожнага з двароў. Калгасам адводзяцца дадатковыя сядзібныя вучасткі для агрэмаджанага гароду, саду, для пляцоў грамадзкага значэньня, для агрэмаджаных гаспадарчых будынкаў і г. д.

Калі ў асабістым карыстаньні калгасьніка, батракоў і беднякоў ня маецца гародных вучастка, ім могуць адводзіцца гароды, якія аспабаніліся ад кулацкіх гаспадарак, або іншыя вучасткі на землях прыгодных для гароду.

9. Калі калгасы арганізуюцца на тэрыторыі вёскі ці буйнога пасёлку то індывідуальныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, якія не ўвайшлі ў гэты калгас, перасяленьню не падлягаюць.

Пры арганізацыі калектыўных гаспадарак на тэрыторыі дробна пасялковага ці хутарскога зямлякарыстаньня індывідуальныя гаспадаркі, не ўвайшоўшыя ў склад калгасу, могуць быць пераселены на тыя вучасткі, якія аспабаніліся ад гаспадарак увайшоўшых у калгас, або на былыя кулацкія зямлякарыстаньні. Пры гэтым неабходна:

а) выдзелы зямельнага вучастку для калгасаў рабіць такім чынам, каб па магчымасьці меншая колькасьць двароў падлягала перасяленьню;

б) шырока скарыстоўваць замену будынкаў паміж калгасьнікамі і індывідуальнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі (з адпаведнымі даплатамі ў патрэбных выпадках), прычым абмен гэты робіцца пры сапраўднай добраахвотнай згодзе старон;

в) бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам, якія перасяляюцца ў зьвязку з арганізацыяй калгасаў, неабходна аказваць дапамогу з боку дзяржаўных органаў і каапэрацыйных, грамадзкіх арганізацый і калгасаў па пераносе будынкаў на новае месца.

Тэрмін пераносу будынкаў з тэрыторыі, адведзенай пад калгасы устанаўляецца ня звыш году.

10. Калі зямляўпарадкаваньне калгасу зроблена з яўным і грубым парушэньнем дырэктыў, з парушэньнямі зямлякарыстаньня бядняцка-серадняцкага сялянства, неабходна да азімага пасеву выправіць гэтыя парушэньні з тым, каб забясьпечыць нармальнае разьвіцьцё калгасаў і інтарэсы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

11. Зямляўпарадкаваньне калектыўных гаспадарак і тэрытарыяльна зьвязаных з імі індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак павінна, як правіла, праводзіцца з адначасовым адводам усіх зямель (як пахатных, так і сенажаці) і з вызначэньнем палёў севазвароту. Калі арганізаванай або ўзбуйняемай калектыўнай гаспадарцы патрэбна прыступіць да карыстаньня зямлёй з бліжэйшага пэрыяду палявых работ да якога немагчыма правесьці стапае зямляўпарадкаваньне, то ў такіх выпадках неабходна выдзяляць паасобныя палі ці вучасткі пад азімы, яравы пасеў ці папар або сенажаць ці выган без адначасовага ўпарадкаваньня ўсіх зямель—гэта робіцца спрошчаным парадкам (шляхам зямляпаказаньняў) у кожным выпадку з дазволу раённага выканаўчага камітэту.

12. Разьмеркаваньне пахатных і сенажатных ужыткаў, якія адводзяцца індывідуальным бядняцка - серадняцкім гаспадаркам, не ўвайшоўшым у калгасы, між паасобнымі дварамі робіцца сельсаветам; зямельныя органы пазінны ў патрэбных выпадках аказваць сельсаветам і насельніцтву інструкцыйную ці тэхнічную дапамогу ў разьмеркаваньні палос ці вучасткаў, асабліва захоўваючы пры гэтым інтарэсы бядняцкіх і маламоцных серадняцкіх гаспадарак, сем'яў чырвонаармейцаў і былых чырвоных партызан. Разам з гэтым зямельныя органы, а таксама РВК і сельсаветы павінны ў працэсе правядзеньня зямляўпарадчых работ прымаць меры растлумачальнага характару да арганізацыі таварыстваў па суцэльнай апрацоўцы зямлі з тых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія ўстрымаліся ад ўваходу ў арцелі.

13. Выганы і пасьбішчы, вадапоі, глінішчы і іншыя вучасткі, якія да выдзелу зямель калгасам знаходзіліся у агульным карыстаньні ўсіх двароў вёскі, павінны заставацца ў сумесным карыстаньні калгасаў і індывідуальных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак, калі па мясцовых умовах няма магчымасьці адвесьці паасобныя вучасткі для калгасаў, і індывідуальных гаспадарак або калі ў гэтым няма спэцыяльнай патрэбы.

14. Для правядзеньня зямляўпарадкаваньня ў зьвязку з адводам зямель калектыўным гаспадаркам, індывідуальныя гаспадаркі, не ўвайшоўшыя ў склад калгасаў, павінны таксама, як і калгасы, прадстаўляць у адпаведнай частцы патрэбную рабочую сілу, матар'ял і інш.

15. Даручыць Народнаму Камісарыяту Зямляробства на працягу дэкады ўнесьці ў Савет Народных Камісараў зьмену ў законадаўства БССР, якія выцякаюць з гэтае пастановы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

21 чэрвеня 1930 г.

г. Менск.

МЕНСК

НОВЫ АДКАЗНЫ САКРАТАР ЦП САЮЗУ ХЭМІКАЎ

Адказным сакратаром ЦП саюзу хэмікаў БССР абраны рабочы-хэмік тав. Гусеў.

НОВЫЯ АЎТА-МАШЫНЫ ДЛЯ МЕНСКУ

Прэзыдыум АВК узьняў пытаньне перад СНК БССР аб дазволе Белдартрансу набыць 50 новых грузавых аўтамашын для Менску.

ПЛЕНУМ МЕНГАРСАВЕТУ

28 чэрвеня склікаецца чарговы пленум Менгарсавету, на якім будуць разглядацца пытаньні аб пяцігадовым пляне разьвіцьця камунальнае гаспадаркі і жыльлёвага будаўніцтва ў Менску.

АЎТАДОР НА ЎСЕСАЮЗНАЙ АЎТА-ВЭЛАЭСТАФЭЦЕ

На ўсесаюзнай аўта-вэлаэстафэце прымаюць удзел 1 аўтамабіль і шэсьць матацыклетаў Белаўтадору.

УКАМПЛЕКТАВАНЬНЕ У КУРСАЎ

Менская Біржа Працы ск плектаваньне шофэрскіх і па курсы прынята 250 чал навучаньня на курсах--шэс

НОВАЯ ТРАМВАЙНАЯ

З 10 ліпеня ў Менску трамвайны рух па новай лі станцыя—Першая Усебела стаўка. З 10 ліпеня ў Ме працаваць 18 трамвайных

АБСЛУГОЎВАНЬНЕ ЭКСК

Прэзыдыум гарсавету рас ступны плян абслугоўваньн таў Першай Усебеларуска Усяго на выстаўку павінна 50 тысяч іншагародніх экс іх 20 тысяч будуць жыць —членаў прафсаюзаў і 30 т разьмешчаны у прафсаюз Харчавацца экскурсанты бу лоўках МЦРК.

Паведамленьні

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У пак. № 21 індывід. кансультацыя па матэматыцы і фізыцы. Пач. а 6 гадз.

Кастрыч. РК. У памяшк. РК адбудзецца пасяджэньне жаночай сэкцыі МОПР'у. Яўка членаў сэкцыі абавязкова. Запраш. актыў. Пач. а 7 гадз.

Фрунз. РК МОПР'у. У памяшк. АК МОПР'у адбудзецца пашыранае пасяджэньне жаночай сэкцыі МОПР'у. Яўка членаў сэкцыі абавязкова. Запраш. актыў. Пач. а 7 гадз.

Пушкінская біб-ка. З прычыны перавучоту навуковы аддзел біб-кі ад 1-VII будзе закрыты на 1 месяц. Просьба да чытачоў здаць кнігі.

Ад камісіі па чыстцы апарату НКА. А 7 гадз. веч. у доме Асьветы адбудзец па даклад аб выніках агляду работы НКА ў сувязі з чысткай. З гэтага дня пачынаецца індывідуальная чыстка працаўнікоў НКА. На чыстку запраш. рабочыя прадпрыемстваў, рэвсаўты УМТ'у, брыгадзіры, асьветнікі і студэнцтва.

ЗАЎТРА

БДУ. У акт. залі адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае выпуску 4-х курсаў пэдфаку. Запраш. настаўнікі-слухачы перападрыхтоўчых курсаў грамадазнаўства і прыродазнаўства і рабочыя-слухачы курсаў па падрыхтоўцы ў ВНУ. Пач. а 7 гадз.

Вайск. габін. БДУ. Студэнты першых курсаў усіх факультэтаў мужчыны і жанчыны, якія па розных прычынах не прайшлі практычных заняткаў па тапаграфіі (вокамерных здымкаў), абавязаны 25 чэрвеня сабрацца ў вайсковым габінэце для правядзеньня заняткаў па тапаграфіі.

ЦП саюзу працасьветы. А 7 гадз. веч., у памяшк. ЦП, адбудзецца нарада адказных сакратароў ГК і МК г. Менску, дзе будзе стаяць пытаньне аб с.-г. выстаўцы і аб летняй працы. Яўка абавязкова.

Саюз Белпрацасьветы. Экскурсія на маршруце Менск-Ленінград, якая была вызначана на 2 ліпеня, паводле атрымаўшага паведамленьня ад ЦК саюзу, пераносіцца на 15 ліпеня. Удзельнікі экскурсіі павінны зьяўляцца ў Менск 15 ліпеня.

Дом Асьветы. Юнсэкцыя Дому Асьветы арганізуе экскурсію асьветніцкай моладзі на Асінбуд. Выезд з Менску 24-VI. Праезд за кошт Юнсэкцыі.

Ад Фрунзаўскага РК КП(б)Б

Фрунз. РК КП(б)Б прапануе на сходах ячэек КП(б)Б і агульных сходах рабочых на прадпрыемствах паставіць пытаньне аб рабочым забесьпячэньні, дакладчыкамі па гэтым пытаньні вылучаны наступныя т. т.: Гольдбэрг (Дзяржплян), Хацкевіч (ЦВК), Палякоў (Белпайгандаль), Якаўлеў (рэд. «Рабочий») і Камэнштэйн (АК КП(б)Б)—да за «Камунар»; Дунец (рэд. «Акцябр»), набродаў (НКА), Сакольскі (ЦВК) і сіна (рэд. «Рабочий»)—да ф-кі «Кас нік»; Белашэўскі (Камвуз), Цыпу (Камвуз), Бэнак (СНК), Шэйнін (Дз гандальбел) і Мітлін (рэд. «Зьвязда» да Белдзяржбуду; Бялуга (БАН), рашкевіч (ЦВК), Ашаровіч (Дзяржп дальбел), Луцкевіч (Белпайгандаль Будзінскі (ЦК КП(б)Б)—да 1 друка Малакоў (рэд. «Акцябр»)—Белжыл зу; Сандлер (Белдзяржстрах), Вера чык (Наркамгандаль), Ігнатоўскі (Б —да Гандальбуду; Грысевіч (ВСНГ Садоўскі (Камвуз)—да заводу «Др апрацоўшчык»: Шастакоў (Дзяржпл да ф-кі «Беларуска»; Дубавіцкі (СН ф-ка «Чырв. Тэкстыльшчык»; Ерм (Акрана)—Эльвод; Калманоўіч (Лесб з-д «Пралетары»; Тарасэвіч (ПП са харч.)—ф-ка «Беларуска»; Гофман КП(б)Б) — футравая ф-ка; Шук («Бел. Вёска»)—Хлебазавод; Гні віч (НКПрацы)—шпалерная ф-ка; чыцкі (НКЗ)—аўтакіраўніцтва; О (АК КП(б)Б)—адда. хлебазаводу; І цыпэр (НКАховы здар.)—друк АВК; крапэвіч (НКА) — каапэрацыі прадпр.; Казак (БАН)—сталоўкі МЦ Якубчык (БАН)—пажарн. кам.; Бу (Камвуз)—школа краўдоў; Гур (ЦК КП(б)Б)-рымарск. ф-ка; Ізраіліт (бел)—саюз будаўнікоў; Рагазіньні (ЦК КП(б)Б і Мачульскі (Белдартр —ф-ка «Камунарка»; Калмык (МОПР'у), Іофэ (Дзяржгандаль) і Куг (польпэдтэхнікум)—Гандальбуд.

Усе вылучаныя дакладчыкі павін зьявіцца ў культпроп РК і атрым матар'ялы для дакладаў.

Папраўкі

У № 145 газэты «Зьвязда», у арты ле «Апартуністычная практыка парт пага кіраўніцтва Горацкай с.-г. акад па віне друкарні дапушчаны дзьве мылкі: 1) Замест—«Найважнейшыя п тыйныя дакуманты, як адозва УсесКП(б) аб калгасным будаўніцтве тыкулы тав. Сталіна па пытаньнях лектывізацыі зачынены несвалчасова ў радзе ячэек фармальна»...—трэба чытаць: «былі прапрацаваны несвалча ва, а ў радзе ячэек фармальна».

2) Замест «...студэнцтва вобмацк стыхійна, штосьці рабіла само пась пераходу работы акадэміі на актыўн мэтады»....—трэба чытаць: «студэнц вобмацкам, стыхійна, штосьці рабіла мо адносна пераходу работы акадэміі актыўныя мэтады».

У тым-жа нумары газэты, на 1-й с ронцы, у загалоўку артыкулу—«Пісь рыя аднаго перавароту» трэба сло «перавароту» чытаць у двукосьсях.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Нездавальняюча праводзіцца фінансавы плян спажывецкай каапэрацыі

Напружанае фінансавае становішча спажывецкай каапэрацыі патрабуе асаблівай увагі ўсёй сыстэмы да выкананьня фінансавых плянаў 3 і 4 кварталу. Між тым, дагэтуль спажывецкая сыстэма не зварачала належнай увагі на пытаньні выкананьня фінансавага пляну. І трэба адкрыта прызнаць, што плян за першае паўгодзьдзе сарваны як па гарадзкой, так і па вясковай сетцы.

Шматлікія дырэктывы праўленьня Белкаапсаюзу аб узмацненьні збору сродкаў, скарачэньні таварных рэштак засталіся толькі дырэктывамі на паперы, без выкананьня.

Фінансавы плян на трэці квартал прадугледжвае сабраць па гарадзкой сетцы паявых узносаў на 900 т. р., дагэтуль сабрана каля 200-220 тыс. руб., што складае 22,5 проц. выкананьня пляну. На сельскай сетцы прадугледжвалася сабраць у 3 квартале каля 2 млн. руб., а фактычна сабрана каля 500 тыс., што складае выкананьне фінпляну на 25 проц.

Яшчэ больш дрэнна выконваецца гадавы фінплян па зборы паявых узносаў. Паводле пляну на 29-30 год, трэ' было сабраць паявых узносаў звыш 2 з пал. млн. руб. Усяго сабрана нямногім больш 800 тыс., што складае па гарадзкой сетцы 31,5 проц. выкананьня пляну. Трэба адзначыць, што плян збору паёў на вёсцы лепш выконваецца, чым у горадзе. Калі гарадзкі сэктар выканаў гадавы плян толькі на 31,5 проц., дык вясковы сэктар выканаў яго на 57 проц.

Збор мэтавых узносаў на будаўніцтва, збор укладаў і авансаў па тавары, прадугледжаны прамфінпляном, у большасьці каапэрацыйных арганізацый не праводзіцца. Найбольш адстаюць у выкананьні фінансавага пляну спажывецкай каапэрацыі Аршанская і Гомельская акругі, якія выканалі нязначны процант квартальнага і гадавога заданьня.

Г.

Не дапусьціць спыненьня выхаду шматтыражак

За апошні час да нас даходзяць трывожныя сыгналы аб спыненьні выхаду друкаваных шматтыражак.

Далёка за фактамі хадзіць ня трэба. Барысаўская раённая калгасная газэта «Калгасьнік» спыніла свой выхад. Паводле вестак, якія ў нас ёсьць, газэта больш ня выходзіць з тэй прычыны, што Барысаўскі РВК і іншыя арганізацыі адмовіліся даваць сродкі.

Такая-ж перспэктыва прадбачыцца і для шматтыражкі «Чырвоны Бярэзінец», бо ФЗК сродкаў ня мае для выпуску газэты, а ЦП саюзу хэмікаў марыцца заяву ФЗК ужо некалькі тыдняў, куды зьвярнулася ФЗК «Чырвонай Бярэзіны» за дапамогай, а пакуль што газэта таксама ня выходзіць. Рэдактар газэты тры месяца не атрымлівае пэнсіі.

Аналёгічныя трывожныя сыгналы аб згортваньні работы фабрычна-заводзкіх і калгасных шматтыражак ёсьць і з іншых округ і раёнаў БССР.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб недавцэнцы важнасьці друкаванай шматтыражкі з боку грамадзкіх арганізацый.

З гэтай недаацэнкай трэба з усёй рашучасьцю змагацца. Вінаватых у нядбайнасьці да працы шматтыражак трэба прыцягнуць да партадказнасьці і ні ў якім разе нельга дапусьціць спыненьня рэгулярнага выхаду шматтыражак.

Цудзін.

З лістоў рабселькораў

КАГО ТРЭБА РАЗБУДЗІЦЬ

Белдзяржбуд заключыў дагавор з заводакіраўніцтвам «Энэргія» пабудаваць кацельны цэх. Падрыхтоўка да будаўніцтва пачалася ў лютым месяцы. Пабудаваны часовыя хлявы, падрыхтавана яма для вапны і прывезена нязначная частка матар'ялу. Але будаўніцтва цэху не пачынаецца.

Заводакіраўніцтва таксама адносіцца да будаўніцтва з халадком. На тэрыторыі, дзе мяркуецца пабудаваць кацельны цэх, стаіць яшчэ дзеравянае памяшканьне мадэльнага цэху і адміністрацыя пакуль што ня думае яго зносіць.

В.

ВЫЛУЧЭНЕЦ БЕЗ КВАТЭРЫ

Рабочы Юрчык вылучан на работу ў Гомельскі малочсаюз у якасьці члена праўленьня. Сям'я яго знаходзіцца ў Добруцы, на адлегласьці 25 клм. ад Гомелю. Ня раз Юрчык зварачаўся ў камгас, каб атрымаць кватэру, але ніякіх выпікаў няма. Прыходзіцца Юрчыку часта начаваць на сталах, або ў іншым месцы.

Гомельскі камгас павінен неадкладна адшукаць кватэру для рабочага-вылучэнца.

КУЦЕНАЎ.

ПРА СІЛАС НІЧОГА НЯ ЧУВАЦЬ

У Бягомльскім раёне ёсьць 5 жывёлагадоўчых калгасаў.

Але ад сіласаваньні кармоў ніхто з калгасьнікаў нічога ня ведае. У раймалжывсаюзе кажуць, што пляны сіласаваньня адкладзены на другі год.

РВК і РК партыі гэтым пытаньнем ня цікавяцца, а аграномы таксама нічога ў гэтым напрамку ня робяць. З 29 калгасаў ні ў адным з іх няма ямы для сіласу. Трэба зьвярнуць на гэта належную ўвагу.

Б—а.

Адлічэньні ў фонды калгасаў

Наркамзем і праўленьне Белкалгасцэнтру разаслалі абежнік усім акрэа і саюзам калгаснай каапэрацыі наконт адлічэньняў у непадзельныя і грамадзкія фонды калгасаў. У сувязі з тым, што асноўная маса калгасаў арганізавалася толькі ў пачатку гаспадарчага году і яшчэ не ўзмацнілася, устанаўляюцца адлічэньні ў непадзельныя фонды ў разьмеры 10 проц. і ў грамадзкія фонды—у разьмеры 5 проц.

Адлічэньні робяцца з атрыманага прыбытку калгасу, за вылікам насеннага фонду для забесьпячэньня поўнага абсемяненьня пасеўнай плошчы, запасу на фураж і пракорм абагуленай жывёлы і выдаткаў па аплаце с.-г. падатку і страхаваньня маемасьці калгасаў.

СЕРАДА 25 ЧЭРВЕНЯ

Пашыранае пасяджэньне Мен. АК МОПР'у

Ленскі Акруговы Камітэт МОПР'у

)—(СКЛІКАЕ)—(

пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму з удзелам старшынь дзесяці вясковых РК МОПР'у

(у памяшканьні Мен. АК МОПР'у, Сав. 87).

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Даклад аб выніках Усесаюзнай арг. нарады МОПР'у дакл.—т. КАЛМЫК

2) Аб парадку ўдзелу МОПР'у ў сьвяткаваньні 10-цігодзьдзя вызваленьня БССР ад беланаляку дакл.—тав. ЦУДЗІН.

3) Інфармацыя штаба-кіраўніцтва сезоньнікамі.

З прычыны важнасьці пытаньняў яўка для ўсіх членаў І канд. АК, гарадзкіх РК МОПР'у, а таксама старшынь бюро ячэек—абавязкова.

Запрашаецца жактаўскі жаночы актыў.

Пачатак роўна а 7-й гадз. МЕН. АК МОПР'У.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР | Гастролі 1-га Маскоўскага перасоўнага тэатру ОПЭРЫ і БАЛЕТУ
Сёньня, 24 чэрвеня „ФЛОРИА ТОСКА" опера муз. ПУЧЧІНІ
Білеты ў касе тэатру і раб. касе. ПАЧАТАК А 9 ГАДЗ. 30 М.
АНОНС! У аўторак, 24 чэрвеня „РУСАЛКА" ранішні спэктакль

Кіно-тэатр „Культура" — Мастацкая гэраічная кіно-паэма ЗМОВА МЕРТВЯЦОЎ у 7 частках. Галоўныя ролі выконваюць: Ангельскі генэрал—Д. Гутман, зрадзнік—П. Кузьняцоў, Н. Пятроў, В. Таскін, Е. Чарвяноў. Белы афіцэр—Сямёнаў і інш. Пачатак роўна а 8 гадз. | КАСА ад 6 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — З ПРЫЧЫНЫ ПОСЬПЕХУ 2-гі тыдзень пастаноўкі 2-гі немецкі фільм „ДЗЕЛАВЫ ЧАЛАВЕК" Пачатак 1-га сэансу а 7-й гадз. Каса ад 5 г.

КІНО Пралетары — Мастацкі заможны фільм ЧЫКАГА драма у 8 ч. У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: Філіс Хэвер і Вітэр Варконі. ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 7 ГАДЗ. Каса—ад 5 гадз.

1-кы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — ПРЫГОДЫ АРЫШКІ у 6 частках. Пачатак 1-га сэансу а 2 гадзіне. Каса ад чынена з 12 : гадзін.

Кіно „СПАРТАК". Ад панядзелка, 23-га чэрвеня выдатны бытавы фільм ТРЫПОЛЬСКАЯ ТРАГЭДЫЯ у 7-мі частках. УВАГА: Сёньня 4 сэансы. ПАЧАТАК 1 с.—6 г. 30 м., 2 с.—8 г., 3 с.—9 г. 30 м., 4 с.—11 г. КАСА—ад 5 гадз. 30 м.

ДОМ АСЬВЕТЫ. 25-га чэрвеня адбудзецца ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ вядомага маскоўскага сьпевака барытона ЛЮБІМАВА з вядомай п'яністкай віртуоза АРОНАВАЙ. Білеты прадаюцца ў Доме Асьветы ад 12 г. да 2-х дня і з 6 да 10 гадз. веч. для членаў саюзу працасьветы. Пачатак а 10 гадз.

КІНО-САД АД АЎТОРКА, 24 ЧЭРВЕНЯ ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ МЕРТВАЯ ПЯТЛЯ драма ў 8 частках. У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: ЖЭНІ ЮГО, ВЭРНЭР КРАУС. Пачатак 1-га сэансу а 9 гадз. Каса адкрыта ад 6 гадз.

НАРКАМЗЕМ БССР тэрмінова ЗАПРАШАЕ СПРАКТЫКАВАНАГА ІЖЫНЭРА-БУДАЎНІКА для плянава-кантрольнай работы. ПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ. Прапановы накіроўваць: Менск, НКЗБ, Савецкая, 71, Сэктар Індустрыялізацыі.

УСЕ РАБОЧЫЯ ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ „Кастрычнік" павінны зьявіцца а 9 гадз. раніцы 25 чэрвеня на фабрыку для азнаямленьня са сваёй апэрацыяй і атрыманьнем карткі пяціднёўкі. Дырэкцыя фабрыкі.

ВСЕ РАБОТНИКИ СИСТЕМЫ ТОРГОВЛИ, ТРАНСПОРТА И ФИНАНСОВ, ПАРТИЙНЫЕ, ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЕ, СОВЕТСКИЙ АКТИВ И КООПЕРАТИВНЫЕ РАБОТНИКИ ДОЛЖНЫ БЫТЬ ПОДПИСЧИКАМИ И ЧИТАТЕЛЯМИ БОЛЬШОЙ ЕЖЕДНЕВНОЙ ГАЗЕТЫ Экономическая Жизнь

На страницы газеты Экономическая Жизнь находят свое отражение: все вопросы важнейших отраслей народного хозяйства — финансов, транспорта, земли и распределения; все общие вопросы экономической политики, плановой работы, проблемы международного положения и мировой экономики.

Орган Народных Комиссариатов СССР: Внешней и Внутренней Торговли, Путей Сообщения и Финансов.

Должны выписывать газету Экономическая Жизнь все учреждения, организации и предприятия железнодорожного, водного, местного и воздушного транспорта: все торговые организации — хозорганы, объединения и предприятия системы Наркомторга; все организации системы ВКОпна — финорганы, — банки, сберкассы и т. д., все промышленные, хозяйственные и кооперативные организации и предприятия.

Подписная плата: Для учреждений, предприятий и организаций: 1 мес. — 1 р. 40 к., 3 мес. — 4 р. 20 к., 6 мес.—8 р., 12 мес. — 16 р. Для индивидуал. подписчиков (членов союза). 1 м.—1 р., 3 м.—3 р., 6 м.—6 р., 12 м.—12 р. Для заграницы (в инозем. долл.): 1 мес.—1 долл., 3 мес. — 3 долл., 6 мес. — 5 долл. 50 цент., 12 мес.—10 долл.

Подписка принимается: В Издательстве газеты „Экономическая Жизнь" (Москва, 9, Тверская, 34, телеф 2-31-82), своими уполномоченными по учреждениям Наркомторга, Наркомфина и по железно-дорожному транспорту через почтовые газеты „Гудок", всеми почтово-телеграфными предприятиями СССР и письмоносцами, всеми Отделениями Союзпечати.

МЕНАЗЕТ доводзіць да ведама, што АДЧЫНЕНЬНЕ акруговай кан-фэрэнцыі АЗЕТ АДБУДЗЕЦЦА 28 чэрвеня г. г. а 7 гадз. веч. у памяшканьні клюбу харчавікоў (рог Інтэрнацыянальнай і Камсамольскай). Прапануецца ўсім раённым і гарадзкім ячэйкам